Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КРАСАВІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 81 (27939) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# СТВАРАЦЬ І РАЗВІВАЦЦА — ДЗЕЛЯ НАРОДА



Фота БЕЛТА.

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выступіў з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Штогадовы традыцыйны зварот кіраўніка дзяржавы да яе грамадзян і парламента — адна з самых значных падзей у грамадскім і палітычным жыцці краіны, бо падчас яго агучваюцца праблемы і задачы, якія патрабуюць вырашэння ў бягучым годзе. Са слоў пра гэта і пачаў Прэзідэнт, дадаўшы: «Я разумею, што сённяшняя размова ў Авальнай зале будзе ўсяляк аналізавацца, шмат будзе меркаванняў, размоў — на кухнях, у працоўных калектывах, у сродках масавай інфармацыі... Апярэджваючы ўсё гэта, хацеў бы папрасіць усіх вас, каб, ацэньваючы Пасланне, вы мелі на ўвазе, што ў нас вельмі насычаны год, і Пасланне будзе крыху своеасаблівым, актуальным і, зразумела ж, будзе ўлічваць усе мерапрыемствы, якія пройдуць на працягу гэтага года».**

## ЮБІЛЕЙ ПЕРАМОГІ, ВЫНІКІ РЭФОРМАЎ, ВЫБАРЫ

Адна з самых важных дат сёлета — 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў найбліжэйшы час будуць сур'ёзна прааналізаваны падзеі, звязаныя з гэтым юбілеем. «Вельмі шмат інсінуацый, спроб перапісаць гісторыю, абвінаваціць нас у гэтай вайне, што мы сталі ледзь не прычынай. Па гэтым пытанні будзе сказана ў далейшым нямала», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, у Беларусі адбудзецца значнае ваенна-палітычнае мерапрыемства — парад Перамогі. «Зразумела, і на гэтую тэму ўлада павінна даць сваё вызначэнне і сваё стаўленне да гэтага», — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама нагадаў аб дамоўленасці на працягу года правесці як мінімум тры нарады па важных, актуальных пытаннях развіцця краіны. У прыватнасці нарады будуць прысвечаны абмеркаванню праблем развіцця сельскай гаспадаркі, сферы ЖКГ і адукацыі. Па ўсіх гэтых напрамках былі створаны адпаведныя рабочыя групы, якія сур'ёзна прааналізавалі сітуацыю і ўнеслі прапановы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на нарадах будзе падведзены вынік: было рэфармаванне памылковым ці ўсё ж правільным.

«Я не стану ўтойваць: перадвыбарная праграма Прэзідэнта *(чытай — улады)* — гэта будзе кароткае акумуляванне ўсіх пытанняў, што мы вырашылі, будзе паказаны той узровень, на які мы выйшлі, і, самае галоўнае, пастаўлены задачы, якія ўлада абяцае вырашыць у будучае як мінімум 5-годдзе, а можа, і больш», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## ВАЖНАСЦЬ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ

«Мы заўсёды ішлі гэтым шляхам — шляхам прамой, шчырай размовы ўлады і народа. І ў далейшым не будзем адступаць ад гэтага правіла», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў краіне не так даўно «супакоілі» сітуацыю на валютным рынку. Аднак тэмпы росту эканомікі скараціліся, многія прадпрыемствы загружаны прадукцыяй, якая не мае збыту.

Паводле слоў Прэзідэнта, у СМІ, у грамадстве ўсё часцей абмяркоўваюцца вострыя пытанні. У прыватнасці, чаму засталіся нявыкананымі тыя абяцанні па сярэдняй зарплаце ў краіне, якія ўлада публічна давала людзям, чаму буксуе прамысловасць, нягледзячы на значную дапамогу дзяржавы і пастаянную ўвагу на ўсіх узроўнях улады? «Але, галоўнае, людзі чакаюць адказу на ключавое пытанне: што будзе далей? Што будзе з курсам рубля і цэнамі? Што будзе з рабочымі месцамі як на дзяржпрадпрыемствах, так і ў прыватным сектары? Што новага прапануе ўлада ў адказ на відавочныя крызісныя з'явы ў нашай эканоміцы і ў эканоміцы нашых суседзяў?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта складаныя і часта непрыемныя пытанні», — прызнаў Аляксандр Лукашэнка. «Лягчэй за ўсё было б адысці ад іх і зрабіць выгляд, што нічога не адбываецца. Але па-сапраўднаму моцная палітыка заўсёды заснавана на шчырасці. Сумленнае прызнанне праблемы — гэта палавіна яе вырашэння», — лічыць беларускі лідар.

СТАР. 2

# СВЯТА МІРУ, ВЯСНЫ І ПРАЦЫ

**ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!**

Ад усёй душы віншую вас са Святам працы.

Па традыцыі мы адзначаем яго як знак павагі да людзей розных прафесій і пакаленняў, як сімвал салідарнасці працоўных.

У год 70-годдзя Вялікай Перамогі над фашысцкімі агрэсарамі мы выказваем сардэчную ўдзячнасць ветэранам, працоўным калектывам, якія адрадзілі нашу краіну ў пасляваенны час. Іх эстафету працягваюць новыя пакаленні, якія карпатлівай і плённай працай умацоўваюць нашу родную Беларусь, памнажаючы яе нацыянальнае багацце.

Працавітасць беларускага народа служыць надзейным фундаментам дабрабыту дзяржавы. Нашы дасягненні ў розных галінах прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы і сферы высокіх тэхналогій ствараюць упэўненасць у заўтрашнім дні.

Няхай гэта свята прыйдзе ў кожны дом, прынёсшы з сабой мір і дабро. Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Добрая навіна

## 3 мая ўзрастуць дзіцячыя дапамогі

Аб гэтым паведамілі ў аддзеле народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Пастановай міністэрства зацверджаны новы бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ), які з 1 мая па 31 ліпеня 2015 года ў разліку на месяц складае Br1 млн 474 тыс. 870. Гэта на 3,3% перавышае нарматыў, які дзейнічае з 1 лютага па 30 красавіка бягучага года. Адпаведна на 3,3% павысяцца памеры некаторых відаў дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Так, аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці (10 БПМ) складзе з мая гэтага года Br14 млн 748 тыс. 700, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей (14 БПМ) — Br20 млн 648 тыс. 200. Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, — Br1 млн 474 тыс. 900 (100% БПМ).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.04.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14470,00 | ▼ |
| Еўра | 15910,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 689,05 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СТВАРАЦЬ І РАЗВІВАЦЦА —

## НАШЫ НАЙВЯЛІКШЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

«Трэба прызнаць, што сітуацыя ў свеце апошнім часам змяняецца значна больш імкліва, чым мы маглі сабе ўявіць. Ну хто мог уявіць, што ў суседняй з намі Украіне будуць падаць бомбы і рвацца снарады? Што ў Еўропе зноў запахне вялікай вайной і градус напружання паміж вялікімі дзяржавамі вырасце да ўзроўню халоднай вайны? І гэта ўжо ніхто не ўтойвае, у тым ліку і ў гэтых вялікіх дзяржавах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Наша заслуга ў тым, што Беларусь застаецца астраўком міру, спакою і парадку», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што «нехта забыў урокі Вялікай Айчыннай вайны», сямідзесяцігоддзе заканчэння якой будзе адзначацца праз некалькі дзён. «Гэтыя ўрокі мог забыць хто хочаце, але толькі не беларусы. Тая вайна каштавала нам мільёны жыццяў, і таму, нягледзячы на час, мы цвёрда ведаем і помнім — няма на зямлі нічога даражэйшага, чым мір», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сёння перад народам стаіць задача зберагчы найвялікшыя каштоўнасці — мір, парадак і незалежнасць Беларусі.

«Дзякуй богу, што сёння лёс нашай краіны вырашаецца не на франтах, не на плошчах. Наша будучыня вызначаецца ў іншай, мірнай, сферы — у эканоміцы. Але менавіта тут нам даводзіцца весці бой з вельмі неспрыяльнымі знешнімі ўмовамі, а таксама з уласнымі лянотай, памылковымі думкамі, безадказнасцю і непрафесіяналізмам», — лічыць беларускі лідар.

На думку Прэзідэнта, ад добрасумленнай працы кожнага, ад дакладнасці і правільнасці рашэнняў улады сёння залежыць вельмі многае. «Не першы раз кажу: менавіта ў эканоміцы гарантыя нашай незалежнасці, залог міру і фундамент будучыні. І менавіта эканоміка сёння перажывае не найлепшыя часы», — адзначыў ён.

## НЕАБХОДНА ШУКАЦЬ НОВЫЯ ФАКТАРЫ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прычыны складанай сітуацыі ў эканоміцы відавочныя — гэта санкцыі супраць галоўнага партнёра Беларусі, падзенне коштаў на нафту, дэвальвацыя расійскага рубля, звужэнне расійскага рынку. Усё гэта прывяло да натуральнага і рэзкага падзення збыту прадукцыі на рынках ключавых партнёраў Беларусі — Расіі, Украіны і Казахстана, усёй постсавецкай прасторы.

«Няма продажу — няма выручкі ў прадпрыемстваў. У выніку менш валюты, падаткаў, грошай у бюджэце. Адсюль немагчымасць павышаць зарплату, скарачаецца занятасць людзей. Гэтыя знешнія фактары нам непадуладныя. Мы жывём у глабальным свеце, і ў нас адкрытая эканоміка, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Праблемы суседзяў неадкладна становяцца нашымі ўласнымі. І гэта аб'ектыўны бок крызісных з'яў».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што за апошнія дваццаць гадоў сусветная эканоміка радыкальна змянілася і на змену індустрыяльнай эканоміцы ідзе эканоміка ведаў і паслуг. Ён нагадаў, што яна ўжо стала асновай у найбольш развітых дзяржавах свету, такіх як ЗША, краіны Еўрасаюза, Японія, Ізраіль, «азіяцкія тыгры», курс на яе будаўніцтва ўзяў і Кітай, які па праве мае статус «фабрыкі свету». «Перад намі стаіць роўна такая ж задача. І, мабыць, трэба прызнаць, што мы спазняемся з яе рашэннем», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт лічыць, што ёсць і яшчэ адна прычына праблем: якасць і прадукцыйнасць працы, якія не заўсёды канкурэнтныя.

Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што гэта толькі схематычнае пазначэнне прычын цяперашняй сітуацыі, аднак, на яго думку, яно вельмі неабходнае, бо яснае разуменне вытокаў праблем дазваляе хутчэй знайсці шляхі іх рашэння.

«Даючы выразныя адказы на самыя вострыя пытанні людзей, сёння мала сказаць: мы ўтрымаем курс, стрымаем цэны і захаваем працоўныя месцы. Значна важней паказаць, як мы гэта зробім», — падкрэсліў беларускі лідар. Таму да канца года будуць прыняты важныя рашэнні ў эканамічнай палітыцы, якія дазволяць забяспечыць новыя фактары росту.

Пры гэтым Прэзідэнт лічыць непрымальным кабінетны стыль кіравання галінамі эканомікі. «Яшчэ раз хачу падкрэсліць: калі хтосьці ва ўрадзе хоча кіраваць з кабінета, гледзячы ў акно на плошчу, на чысцюткі вакол Дома ўрада, то гэта не той падыход. Так, урад у цэлым адказвае за эканоміку, але эканоміка, урад павінен памятаць аб гэтым, робіцца перш за ўсё на прадпрыемствах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, урад павінен быць сур'ёзным рэгулятарам, які вызначае стратэгію і дамагаецца выканання гэтай стратэгіі, але пры гэтым кожны дзень унікае ў работу таго ці іншага прадпрыемства. «Кожны міністр — член урада, віцэ-прэм'еры і прэм'ер павінны бачыць прадпрыемствы, павінны разумець, якія працэсы адбываюцца ў працоўных калектывах, вырашаць канкрэтныя пытанні і, можа быць, патрабаваць адказу з таго ж дырэктара за вырашэнне пытанняў, калі ён іх не вырашае», — канстатаваў Прэзідэнт. Але гэта не значыць, што ўрад будзе ўмешвацца ў аператыўную дзейнасць дырэктараў і кіраўніцтва прадпрыемстваў, адзначыў ён. «Ні ў якім разе — гэта будзе проста перашкаджаць працы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што кожны павінен займацца сваёй справай і даваць вынік: урад кіраваць эканомікай у цэлым, міністры — галінамі, губернатары — рэгіёнамі, дырэктары — прадпрыемствамі. Міністэрствы павінны заняцца галіновым рэгуляваннем: удасканальваць заканадаўства, распрацоўваць тэхналагічныя стандарты, забяспечваць спрыяльныя ўмовы для вядзення бізнесу, роўныя правы для ўсіх формаў уласнасці.

Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду рэструктурызаваць неплацежаздольныя вытворчасці з прыцягненнем інвестараў. «Падтрымка прадпрыемства, якое аб'ектыўна не трэба рынку і эканоміцы, якое фактычна зжыло сябе і не можа існаваць, — гэта прамое амярцвенне рэсурсаў, калі мы, спрабуючы яго выратаваць, укладваем туды грошы. Ліквідацыя адсталага прадпрыемства — не трагедыя, а элементарны здаровы сэнс. Я б нават не сказаў, што ліквідацыя. Перапрафіляванне такім чынам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, прадпрыемства аказваецца непатрэбным не толькі таму, што там слабае кіраўніцтва або няздайны калектыў — можа састарэць канкрэтны від прадукцыі, звузіцца рынак або выявіцца новы напрамак бізнесу, значна больш выгадны ў параўнанні з ранейшым. «У гэтым выпадку выйграе той, хто першым згортвае бесперспектыўны кірунак, заменьваецца за стварэнне і стварае новы напрамак, гэта значыць, прадукцыю, на гэтым жа прадпрыемстве з гэтым працоўным калектывам», — канстатаваў Прэзідэнт.

Неабходна стварыць такія ўмовы, каб побач з прадпрыемствам, якое зачыняецца, паўставала іншае, больш перспектыўнае, з новымі працоўнымі месцамі і больш высокай зарплатай. «Гэта вырашыць і праблемы занятасці, і будзе толькі стабілізаваць абстаноўку ў працоўным калектыве і нашай краіне», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што хуткая рэакцыя на змененыя ўмовы — залог перамогі ў канкурэнтнай барацьбе. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы даручыў ураду арганізаваць працу па рэструктурызацыі неплацежаздольных вытворчасцяў з прыцягненнем інвестараў.

«Калі мы паралізуем чалавека страхам здзяйснення памылкі, мы гарантавана забіваем любы прагрэс. Менавіта на волі пошуку рашэнняў, на праве рызыкі заснаваны ўсе паспяховыя эканамічныя мадэлі як на Захадзе, так і на Усходзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі той, хто рызыкуе і дбае пра дзяржаву, прадпрыемства і працоўны калектыў, ніколі не будзе пакараны. «Мы заўсёды падтрымаем яго, а памылку дапаможам выправіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## ПРАЦАВАЦЬ НА ВЫНІК

«У 2016 годзе мы ўводзім мараторый на рост колькасці і ставак падаткаў. Адначасова ўбяром залішні кантроль за эканомікай, рэзка скароцім дубліраванне праверак. Трэба ліквідаваць сітуацыю, калі праваахоўныя і кантралюючыя органы, «якія назіралі» за кожным крокам дырэктара, фактычна бяруць на сябе кіраванне прадпрыемствам, не несучы адказнасці за вынікі яго працы», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, неабходна зрушыць акцэнты кантролю з бягучай дзейнасці прадпрыемства на канчатковыя вынікі — прыбытак і рэнтабельнасць.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, калі і прыходзіць на прадпрыемства з наручнікамі, то толькі з цвёрдым перакананнем, што там кіраўнік або група — злачынцы. «Дарэчы, гэта сёння і робіцца. У нас у асноўным буйныя прадпрыемствы маюць, можна так сказаць, індульгенцыю кіраўніка дзяржавы і ўваходзяць у яго кадравы рэестр. Таму ніхто туды без дазволу Прэзідэнта з наручнікамі і пісталетам не прыйдзе і прэтэнзій не прад'явіць», — растлумачыў прэзідэнт. Такія прадпрыемствы Камітэт дзяржбяспекі, МУС ці пракуратура не маюць права кантраляваць сваімі метадамі без дазволу кіраўніка дзяржавы. «Але каб атрымаць такі дазвол, трэба пакласці на стол канкрэтныя факты. Ці хаця б адзін факт. Мы не будзем шукаць дзясятак фактаў, каб выказаць прэтэнзіі няздайнаму кіраўніку. Дастаткова аднаго факта», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў ураду, Адміністрацыі Прэзідэнта, дзяржсакратарыяту Савета бяспекі і адпаведным спецыялістам унесці праекты канкрэтных нарматыўных актаў, якія б раз і назаўжды вырашылі гэтую праблему. «Каб больш ніколі ў грамадстве не было пустых размоў пра звышкантроль за прадпрыемствамі і кіраўнікамі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прыняць неабходныя рашэнні па новым механізме аказання дзяржаўнай падтрымкі. «У бюджэтным працэсе трэба перайсці на выдзяленне сродкаў па праграмна-мэтавым метадзе. Як кажуць эканамісты, бюджэтаванне, арыентаванае на вынік», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. На думку Прэзідэнта, дзяржаўная падтрымка павінна аказвацца толькі на конкурснай аснове, выключна ў ходзе рэалізацыі дзяржпраграм, з роўным доступам да рэсурсаў для арганізацый усіх формаў уласнасці.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў эфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў. «Сутнасць простая — не прасіце больш грошай, па-гаспадарску выкарыстоўвайце тое, што ёсць. Усе скаргі на недахоп абаротных сродкаў, інвестыцый трэба спыніць. Грошы ў эканоміцы ёсць. Але многія прадпрыемствы амярцвілі іх у складскіх запасах, даўгабудах, дэбіторскай запазычанасці. Вось тут трэба шукаць фінансавыя рэсурсы!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў сітуацыю, калі ўрад звярнуўся да яго з прапановай выдзеліць МАЗу Br100 млрд. «У мяне пытанне — чаму гэтаму прадпрыемству? У нас што, няма праблем на іншых прадпрыемствах? Чаму мы ў МАЗ павінны ўкласці гэтыя Br100 млрд? Мы ж гаворым пра тое, што роўны падыход павінен быць да ўсіх», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што прадпрыемствы ў першую чаргу павінны арыентавацца на збыт прадукцыі і заключэнне дагавораў, больш актыўна разгружаць склады. «Дапамагаць будзем. Але не пад абяцанні, а пад канкрэтны кантракт», — заявіў ён. Вяртаючыся да тэмы МАЗа, Прэзідэнт падкрэсліў: «Страціць яго — смерці падобна. Гэта іміджавае прадпрыемства, гэта твар краіны».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка лічыць спрыяльнымі канкурэнтныя ўмовы ў беларускай эканоміцы. «Чаму мы ныем, стогнем і плачам?» — задаў пытанне ён. — У нас што, вайна сёння ідзе? Мы рэсурсы атрымліваем па самай высокай цане? Я не хачу прыводзіць разлікі, колькі мы эканомім толькі на прыродным газе ў сувязі з падзеннем цаны на нафту. У нас нармальная сітуацыя і нармальныя ўмовы. Але трэба напружыцца і вырашаць праблемы. Не можаш вырашаць — сыходзь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на сітуацыю, калі былыя кіраўнікі спрабуюць вярнуцца на працу ў дзяржаўныя органы ў тыя сферы, дзе яны некампетэнтныя. «У такіх выпадках ёсць вольныя прадпрыемствы. Вось табе прадпрыемства — ідзі і працуй, давай вынік», — сказаў Прэзідэнт.

## ЯК ЗРАБІЦЬ КРАІНУ ПРЫВАБНАЙ ДЛЯ БАГАТЫХ ЛЮДЗЕЙ З УСЯГО СВЕТУ?

Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць магчымасць размяшчэння акцый вядучых прадпрыемстваў Беларусі на сусветных біржах. Паводле яго слоў, неабходна задзейнічаць усе сегменты фінансавага рынку — страхавы сектар, рынак каштоўных папер, інвестыцыйныя фонды, мікрафінансавыя і лізінгавыя арганізацыі, пазабіржавы рынак Форэкс і гэтак далей. Пры гэтым варта забяспечыць кантроль з боку дзяржавы. І мегарэгулятарам тут стане Нацбанк. Наш фінансавы рынак павінен быць інтэграваны ў сусветны. Прадпрыемствам і банкам неабходна выходзіць на міжнародныя фінансавыя рынкі і прыцягваць рэсурсы для развіцця. «У бліжэйшы час трэба прапрацаваць магчымасці размяшчэння акцый вядучых прадпрыемстваў краіны на сусветных біржах, каб хаця б прыцаніцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што ў гэтай сувязі выключна важнае пытанне амністыі капіталу. «Сёння ўсе краіны свету змагаюцца за фінансавыя патокі. Пры гэтым традыцыйныя фінансавыя цэнтры робяць усё, каб захаваць свой ранейшы ўплыў і любымі спосабамі не дапусціць з'яўлення новых цэнтраў, прывабных для капіталу. Часта гэта робіцца пад выглядам нібыта барацьбы з ценявым фінансавым сектарам. На самай справе ўсім навязваюцца ўніверсальныя правілы, якія ў канчатковым рахунку выгадныя перш за ўсё абмежаванай колькасці краін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Паслядоўна ўстараняецца магчымасць канкурэнцыі паміж дзяржавамі, стварающа ўмовы для ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін пад штучнай падставай забеспячэння празрыстасці фінансавых патокаў».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сувязі з гэтым неабходна ўважліва прааналізаваць, наколькі адпавядаюць нацыянальным інтарэсам міжнародныя пагадненні па фінансавым маніторынгу. «Вы самі бачыце, якія няпростыя працэсы намеціліся ў адносінах Расіі і заходняга свету. Зараз там вядзецца работа па шырокай амністыі капіталу — фактычна яны спрабуюць вярнуць хоць бы частку фінансавых патокаў, якія ў свой час пайшлі з краіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Мы таксама павінны сур'ёзна падумаць пра тое, як зрабіць Беларусь прывабнай для багатых людзей з усяго свету. Даручаю ураду, парламенту, Нацыянальнаму банку грунтоўна прааналізаваць сусветныя працэсы, якія адбываюцца ў гэтай сферы, у тым ліку прааналізаваць заканадаўства, якое мы маем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама даручыў унесці пакет сістэмных прапаноў па паўнавартасным фарміраванні і эфектыўным функцыянаванні фінансавага рынку і яго рэгулятара. «Прадумайце, што канкрэтна можна было б зрабіць, каб у нашу эканоміку вярнуліся капіталы з ценю, а Беларусь стала сур'ёзным рэгіянальным фінансавым цэнтрам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ЗНАЙСЦІ РЫНКІ, А ПОТЫМ ВЫРАБЛЯЦЬ ТАВАР

Беларусі трэба зрабіць акцэнт на пашырэнні экспартнага кошыка за кошт высокатэхналагічных тавараў, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, пры гэтым трэба мяняць не толькі геаграфію экспарту, але і яго структуру. «Цяпер значную частку беларускіх паставак складаюць сыравінныя тавары: калійныя ўгнаенні, сырая нафта і нафтапрадукты, чорныя металы, драўніна. Абвал хоць бы на адным з гэтых рынкаў негатыўна ўплывае на ўсю нашу эканоміку», — растлумачыў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у краіне патрабуецца змяніць падыходы да продажу айчынных тавараў. «Спачатку неабходна шукаць рынкі, а потым вырабляць тавар. У нас жа робіцца ўсё наадварот. Кожнаму кіраўніку прадпрыемства неабходна зразумець: маркетынг, рэклама, прасоўванне тавару таксама важныя, як вытворчасць, якасць, кошт і сабекошт», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён прызнаў, што засваенне новых рынкаў, пошук партнёраў, наладжванне доўгатэрміновых гандлёвых адносін з'яўляецца няпростай задачай. На яго думку, зніжэнне продажу ў Расіі і ва Украіне неабходна кампенсаваць пашырэннем паставак у іншыя краіны. Пры гэтым нельга зніжаць актыўнасць прасоўвання нашай прадукцыі на традыцыйныя рынкі. «У той жа Расіі трэба даходзіць да кожнага рэгіёну, выкарыстоўваць любую магчымасць. Гэта датычыцца і постсавецкай прасторы», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што прыток валюты ў краіну павінен стаць галоўным клопатам і крытэрыем ацэнкі эфектыўнасці працы кіраўніцтва прадпрыемстваў. «Нельга забываць, што экспарт — гэта асноўная крыніца валюты і гарант стабільнасці беларускага рубля», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## ПРЫВАТНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ — У СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ

Прэзідэнт даручыў актывізаваць прыцягненне прыватных інвестыцый у сельскую гаспадарку. Ён адзначыў: «Ураду неабходна стымуляваць інвестараў на аснове індывідуальнага падыходу да кожнага з іх пры продажы сельскагаспадарчых арганізацый». Не менш актуальнай задачай, паводле яго слоў, з'яўляецца ўкараненне ў сельскую гаспадарку найноўшых дасягненняў навукі і перадавой практыкі.

Прэзідэнт прызнаў, што ў рэспубліцы за апошнія гады шмат чаго дасягнулі ва ўздыме сельскай гаспадаркі. «Цалкам забяспечваем харчовую бяспеку. Значна нарасцілі экспартны патэнцыял галіны, ператварыўшы яе ў адну з важных крыніц паступлення валюты», — заўважыў ён. Беларусь — трэці ў свеце экспарцёр масла, уваходзіць у дзясятак найбуйнейшых экспарцёраў малака, знаходзіцца на лідзіруючых пазіцыях у свеце па пастаўках сыроў за мяжу. Акрамя таго, у краіне засяроджана каля 16% сусветных пасеваў лёну.

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

# ДЗЕЛЯ НАРОДА

«Беларусь практычна цалкам забяспечвае сябе харчаваннем, імпарт складае менш за 10% усяго аб'ёму спажывання, а экспартныя пастаўкі ажыццяўляюцца ў 50 краін свету. Тым не менш галіна мае патрэбу ў новых, больш эфектыўных метадах яе далейшага развіцця», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. На яго думку, цяпер галоўнае — працаваць на прынцыпах самаакупнасці.

Як адзначыў Прэзідэнт, ва ўмовах скарачэння дзяржпадтрымкі важную ролю павінны адыграць такія механізмы, як канкурэнтны адбор і акупнасць праектаў, роўны доступ да крэдытаў і іншых рэсурсаў, а таксама адказнасць за рэалізацыю і дасягненне намечаных паказчыкаў.

## МАЛОМУ І СЯРЭДНЯМУ БІЗНЕСУ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

Аляксандр Лукашэнка даручыў надаць асаблівую ўвагу развіццю ў Беларусі малога і сярэдняга бізнесу. Ён падкрэсліў, што ўмовы адкрыцця, вядзення і закрыцця бізнесу павінны быць простыя і зразумелыя, прычым не на паперы, а на справе. «Ураду разам з прадпрымальнікамі неабходна прасачыць увесь ланцужок ад адкрыцця да ліквідацыі бізнесу. Паглядзіце з пункту гледжання здаровага сэнсу і ў разы скараціце колькасць дакументаў, справаздач, узгадненняў, статыстыкі на ўсіх узроўнях і этапах. Асаблівую ўвагу надайце развіццю малога і сярэдняга бізнесу. Гэта аснова росквіту любой эканомікі і стабільнасці дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

## ЦЭНЫ ПАД КАНТРОЛЕМ

Прэзідэнт канстатаваў, што практычна ўсе цэны знаходзяцца пад кантролем дзяржавы. Гэта стала відавочным у канцы 2014-га — пачатку бягучага года. «Калі нам трэба было стрымаць тых, хто «зарваўся, то мы не стваралі ніякіх структур, не «пылілі» ў сродках масавай інфармацыі, мы ціха і спакойна ўзялі пад кантроль цэны. Калі мы ўбачылі, што нельга залішне іх пераціскаць, то па нейкіх пазіцыях адпусцілі», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён прывёў у прыклад кошт свініны, які не толькі не вырас, але нават знізіўся.

«Цэны залежаць ад нас. І нам трэба раз і назаўсёды прыняць рашэнне — калі мы не можам сёння павысіць зарплату, то і не трэба яе павышаць. У нас яе ніхто не просіць павысіць. Але вы не забірайце другой рукой з кішэні народа грошы, не падвышайце цэны там, дзе можам кантраляваць, — на ЖКП, цяпло, святло», — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, такі падыход неабходна захаваць як мінімум да канца года і паглядзець, якой будзе сітуацыя да 1 студзеня наступнага года.

Кіраўнік дзяржавы лічыць зніжэнне інфляцыі ў краіне прыярытэтнай задачай.

«Макраэканамічная стабільнасць — гэта залог нармальнага бізнесу. Зніжэнне інфляцыі для нас — прыярытэтная задача. Насельніцтва турбуе менавіта рост цэн», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, асноўны шлях стабілізацыі цэн — скарачэнне сабекошту прадукцыі і паслуг, скарачэнне выдаткаў з абавязковым захаваннем дасягнутага ўзроўню дабрабыту насельніцтва. «Значыць, прадпрыемствам прыйдзецца зніжаць выдаткі не за кошт заработнай платы людзей, якую мы сёння на асобных прадпрыемствах несвоечасова плацім», — канстатаваў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што высокая інфляцыя гаворыць пра неэфектыўнасць выкарыстання грошай. «Яны павінны даваць аддачу. Тады і працэнтныя стаўкі будуць нізкімі, і крэдыты даступнымі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт даручыў ураду і Нацыянальнаму банку ўжо ў гэтым годзе выпрацаваць канкрэтную антыінфляцыйную праграму.



Фота БЕЛТА.

## ПЕНСІЙНАЯ СІСТЭМА ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ БЕЗ ЗБОЯЎ

Дзяржава не пакідае без увагі пажылых людзей, якія ўнеслі свой уклад у развіццё краіны і выйшлі на заслужаны адпачынак. Доля грамадзян, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, у рэспубліцы сёння складае 22% (2,1 млн чалавек), а да 2020 годзе гэты паказчык наблізіцца да 27% пры захаванні цяперашніх тэндэнцый. «Шчыра скажу, што забяспечваць фінансавую ўстойлівасць пенсійнай сістэмы з кожным годам становіцца больш складана», — прызнаў Прэзідэнт.

Як і раней, рост пенсійных выплат будзе залежаць ад росту зарплаты ў эканоміцы і магчымасцяў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. «Абавязак дзяржавы — захаваць суадносіны пенсій па ўзросце і сярэдняй заработнай платы на ўзроўні не менш за 40%, як гэта прынята ва ўсім свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама важная задача — актыўны пошук новых рашэнняў па жыццеўладкаванні непрацаздольных грамадзян. Мясцовыя органы ўлады павінны развіваць геаграфію такіх формаў работы, як дамы самастойнага, сезоннага пражывання, прыёмныя, гасцявыя, патранажныя сем'і для пажылых грамадзян. Прэзідэнт даручыў кіраўніку Адміністрацыі Аляксандру Косінцу праверыць, як выконваецца яго даручэнне па ўкараненні новых форм жыццеўладкавання пажылых людзей. «Ні адзін стары ў краіне не павінен быць кінутым, нават калі ў яго недзе на Калыме жывуць дзеці і яны пра яго забыліся, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дзеці і старыя — твар любой дзяржавы. Калі мы нармальна ставімся да дзяцей і старых , значыць, мы маем нармальную дзяржаву, паколькі клапоцімся пра будучыню і пра тых, хто стварыў нашу краіну».

Аляксандр Лукашэнка таксама даручыў ураду распрацаваць Дзяржаўную праграму «Сацыяльная інтэграцыя інвалідаў, грамадзян пажылога ўзросту і фізічна аслабленых асоб на 2016-2020 гады».

## МАГЧЫМАСЦЬ ВЫРАШЭННЯ ЖЫЛЛЁВАЙ ПРАБЛЕМЫ

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што механізм дзяржпадтрымкі будаўніцтва жылля трэба дапоўніць іпатэчным крэдытаваннем. «У жыллёвым будаўніцтве неабходна дапоўніць дзеючы механізм дзяржпадтрымкі іпатэчным крэдытаваннем, сістэмай будаўнічых зберажэнняў, арэндай жылля», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, Нацыянальнаму банку і беларускаму ўраду варта выпрацаваць эфектыўныя крэдытна-фінансавыя інструменты, якія дазволяць забяспечыць доступ да гэтых праграм сярэдняга класа, які фарміруецца ў беларускім грамадстве.

## ІДЭАЛ ГРАМАДСТВА — МОЦНАЯ СЯМ'Я

Моцная сям'я, у якой выхоўваюцца як мінімум трое дзяцей, павінна стаць грамадскім ідэалам, лічыць Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што трэба замацаваць станоўчыя дэмаграфічныя працэсы. З 2013 года ў краіне адзначаецца прырост насельніцтва. «Нам удалося практычна сціснуць «дэмаграфічныя нажніцы», скараціўшы амаль у 4 разы натуральнае змяншэнне насельніцтва за кошт павелічэння нараджальнасці, працягласці жыцця людзей і зніжэння смяротнасці, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — А ўспомніце, літаральна 10 гадоў таму розныя з розных краін, у тым ліку і свае, прагназавалі, што колькасць насельніцтва да 2015 года зменшыцца да 8,3-8,5 млн чалавек. Мы сёння пераваліі за 9,5 млн чалавек». Пры захаванні гэтай тэндэнцыі колькасць насельніцтва краіны можа ўзрасці да 10 млн чалавек.

Такія вынікі дасягнуты шмат у чым дзякуючы развіццю аховы здароўя. У краіне створана шматузроўневая сістэма: ад ФАПаў да рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў, выконваюцца найскладанейшыя аперацыі, у тым ліку па перасадцы органаў. «Умеем рабіць усё», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і канкрэтызаваў: ад аховы здароўя да будаўніцтва атамнай станцыі. «Трэба толькі быць больш смелымі, трэба ісці насустрач праблемам», — лічыць Прэзідэнт.

У Беларусі істотна павышаны памеры сямейных дапамог. Створаны роўныя ўмовы для ўсіх катэгорый сем'яў, іх падтрымка ўзмацняецца з нараджэннем кожнага наступнага дзіцяці. Гэта і надалей будзе заставацца нацыянальным прыярытэтам, запэўніў кіраўнік дзяржавы. На рэалізацыю дадзенага прыярытэту і накіраваны ўказ аб увядзенні сямейнага капіталу.

Прэзідэнт даручыў вырашыць праблему забеспячэння крокавай даступнасці дзіцячых садкоў. «Вядучую ролю ў павышэнні якасці чалавечага патэнцыялу адыгрывае сістэма адукацыі. У арбіту яе дзейнасці прама ці ўскосна ўключана практычна ўсё насельніцтва краіны. Паўсюдна створаны ўмовы для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. Разам з тым не вырашана пытанне забеспячэння крокавай даступнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі, асабліва ў мікрараёнах-новабудоўлях абласных цэнтраў і Мінска. Даручаю аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму вырашыць гэтую праблему, забяспечыць будаўніцтва дзіцячых садкоў», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, таксама неабходна перагледзець функцыянальнасць існуючых аб'ектаў дашкольнай адукацыі. Некаторыя дзіцячыя садкі варта перапрафіляваць, а сродкі накіраваць на іншыя мэты. У некаторых мікрараёнах трэба пабудаваць новыя будынкі. Дзіцячы сад павінен знаходзіцца побач, каб бацькі маглі пакінуць дзіця і спакойна ісці на працу, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## АДУКАЦЫЯ ПОРУЧ З НАВУКАЙ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на расходы ў сферы адукацыі штогод выдзяляюцца вялікія бюджэтныя сродкі. «Неабходна, каб яны выдаткоўваліся з максімальнай карысцю. Як паказвае практыка, цяпер у нас лішак кадраў пэўных спецыяльнасцяў і ў той жа час у розных ВНУ функцыянуе мноства дублюючых факультэтаў. Нам трэба не колькасць, а сусветны ўзровень навучальных устаноў», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Міністэрству адукацыі неабходна дэталёва прапрацаваць гэтыя пытанні і ўнесці канкрэтныя прапановы па далейшай аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі.

«Акадэмічную, галіновую і вузаўскую навуку мы арыентуем на вырашэнне актуальных задач, якія стаяць перад краінай. Для нас асабліва важныя навукова-тэхнічныя, аграрныя і медыцынскія напрамкі, распрацоўкі па якіх запатрабаваныя эканомікай», — сказаў беларускі лідар. «Больш актыўнай ролі ў фарміраванні патрыятычнага светапогляду людзей, развіцці інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу нацыі мы чакаем ад гуманітарных навук. Ідэйная аснова грамадства і дзяржавы павінна быць грунтоўнай і трывалай», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, інтэграцыя адукацыі і навукі — уплыў часу. «Задача заключаецца ў тым, каб рыхтаваць спецыялістаў не толькі для народнай гаспадаркі, але і для навуковых устаноў. Нельга забываць, што ў сучасным свеце вырашальнае значэнне маюць інавацыі. Першую скрыпку тут выконваюць навуковыя распрацоўкі і іх укараненне ў практыку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ПРЫНЦЫП САЦЫЯЛЬНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

«Асноўная мэта сацыяльнай палітыкі дзяржавы — дабрабыт народа, павышэнне ўзроўню і якасці яго жыцця. Клопат аб людзях розных пакаленняў, рэалізацыя прынцыпу сацыяльнай справядлівасці, увага да чалавека — гэта галоўнае для органаў улады», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Часам і я грашу гэтым, але ўрад вельмі тонка гэта адчуў. І ўсе гавораць: у нас народ разбалаваны. Так, крыху недзе разбалавалі народ. Але ж гэта трэба паставіць сабе ў заслугу, што падтрымліваем народ, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мэта нашай дзяржавы і любой улады ў любой дзяржаве — гэта народ. Усё дзеля чалавека».

«Заўтра ўсе будзем на пенсіі, не будзе чорных партфеляў, чорных аўтамабіляў і г.д і да т.п. Рана ці позна мы станем звычайнымі людзьмі, — дадаў беларускі лідар. — Трэба памятаць пра гэта і ствараць нармальную дзяржаву для народа».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, нягледзячы на сённяшнія няпростыя ўмовы, бюджэт 2015 года, як і ў папярэднія гады, захоўвае сацыяльную накіраванасць. Гэта важны фактар забеспячэння згоды ў грамадстве і стабільнасці дзяржавы.

Ён адзначыў, што Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця. І за апошні час узнялася ў адпаведным сусветным рэйтынгу з 58-га на 53-е месца сярод амаль 200 дзяржаў. «Аднак нельга спыняцца на дасягнутым», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, цяпер набывае першараднае значэнне якасць работы з насельніцтвам, прымяненне новых форм і метадаў размоў з людзьмі. Павышэнню адкрытасці дзяржорганаў для ініцыятыў і зваротаў грамадзян служаць штотыднёвыя прамыя тэлефонныя лініі, якія ўвайшлі ў практыку. «Вельмі прасіў бы вас, каб мы з гэтымі тэлефоннымі лініямі не праштрафіліся перад народам і не скаціліся да фармалізму», — адзначыў Прэзідэнт, дадаўшы пры гэтым, што толькі за апошнія два месяцы гэтага года ў рэгіёнах прынята больш як 10 тысяч тэлефонных зваротаў. «І калі мы на гэта пайшлі і атрымалі такія звароты, мы на іх павінны адрэагаваць», — падкрэсліў ён.

«Працэс дэбюракратызацыі работы з насельніцтвам заўсёды быў і будзе важным напрамкам работы любога дзяржаўнага органа, асабліва мясцовага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў Нацыянальнаму сходу ў найбліжэйшы час унесці канчатковыя праекты рашэнняў па аптымізацыі дзяржапарату, а таксама па статусе дзяржслужачага.

«Каб стварыць базу для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў наступным пяцігоддзі, працэс абнаўлення дзяржапарату і ўмацавання кіруючага складу прадпрыемстваў павінен мець сістэмны характар», — лічыць беларускі лідар.

«Ключавы выраз «кадры вырашаюць усё» і сёння не страчвае сваёй актуальнасці і не страціць ніколі», — падкрэсліў Прэзідэнт. У сучасным свеце, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, за прафесіяналаў ідзе барацьба, іх пераманьваюць і перакупляюць. «І калі мы не створым годныя ўмовы для работы кіраўнікоў, то найлепшыя да нас проста не прыйдуць. Страчваць прафесіяналаў мы больш не можам, інакш прайграем у канкурэнтнай барацьбе замежным краінам».

«Трэба помніць, што чалавечы капітал — гэта найважнейшая каштоўнасць у XXI стагоддзі», — дадаў беларускі лідар.

*(Заканчэнне на 4–5-й стар.)*

# СТВАРАЦЬ І РАЗВІВАЦЦА —

## ПРАДКАЗАЛЬНАСЦЬ, СТАБІЛЬНАСЦЬ, ШМАТВЕКТАРНАСЦЬ

«Паслядоўную міратворчую пазіцыю ў свеце займае наша краіна», — адзначыў Прэзідэнт. Таму Беларусь стала найбольш прыдатнай пляцоўкай для нядаўніх перагавораў па Украіне. «Актыўнасць у адносінах да мірнага ўрэгулявання ва Украіне садзейнічае далейшаму ўмацаванню міжнародных пазіцый Беларусі. Але самае галоўнае, што і амерыканцы, і еўрапейцы прызналі (з імі шмат сустракаўся я, наш міністр замежных спраў), што Беларусь сёння адыгрывае адну з найважнейшых функцый у рэгіёне па забеспячэнні бяспекі. Гэта праўда, справядліва», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Нам прынцыпова важна ўмацоўваць у нашых партнёраў усведамленне, што прадказальная і стабільная Беларусь — гэта каштоўнасць для ўсяго свету», — заявіў Прэзідэнт.

«Мы ганарымся тым, што ў нас выдатныя адносіны з такімі гігантамі, як Расія, Кітай, Індыя, наладжваюцца адносіны з Еўрасаюзам», — сказаў беларускі лідар.

«Са свайго боку мы заўсёды гатовы падставіць плячо суседу ў цяжкую для яго хвіліну. І ад нашых партнёраў чакаем паважлівага стаўлення, пазбаўленага прававога нігілізму і санкцыйнага ціску», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Беларусь — гэта надзейнае звяно, якое звязвае Усход і Захад. «Пра гэта сведчыць шматвектарнасць знешнепалітычнага курсу Беларусі, накіраванага на развіццё ўзаемавыгадных адносін з рознымі краінамі свету. Стратэгічная мэта беларускай знешняй палітыкі зразумелая: стварэнне аптымальнага балансу нашых інтарэсаў паміж рознымі цэнтрамі сілы, выбудоўванне раўнапраўнага ўзаемадзеяння з вядучымі гульцамі на міжнароднай арэне», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў, што Беларусь выйшла на ўзровень усебаковага стратэгічнага партнёрства з КНР. «Нас звязваюць шматгадовыя даверныя адносіны. У двухбаковым супрацоўніцтве мы перайшлі ад гандлю да рэалізацыі буйных інвестыцыйных праектаў», — канстатаваў беларускі лідар. Кітайска-беларускі індустрыяльны парк стане пляцдармам для высокатэхналагічных вытворчасцей. У маі гэтага года паміж дзвюма краінамі будуць адкрыты прамыя авіязносіны.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што маючы адбыцца візіт Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Беларусь надасць новы імпульс усебаковаму ўзаемадзеянню дзвюх краін.

Гаворачы аб адносінах з ЗША, Прэзідэнт адзначыў, што станоўча ацэньвае магчымасць іх падключэння да перагаворнага працэсу па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне. «Калі ў ЗША ёсць намер нармалізаваць становішча на паўднёвым усходзе Украіны — яно будзе нармалізавана, сто працэнтаў. Калі ЗША зойме іншую пазіцыю — там не будзе міру. Хто гэтага не разумее? Разумеюць усе, нават звычайныя людзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што калі ў гэтым працэсе спатрэбіцца Беларусь, краіна гатова адыграць сваю ролю. Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў, што аб сустрэчах у мінскім фармаце было шмат напісана. «Шмат хіхікання было, але тое, што ўжо ва Украіне не малоцяць буйнакалібернай зброяй, мінамётамі і артылерыяй, не гінуць тысячы людзей у бойні, — гэта ўжо вялікае дасягненне міжнароднай супольнасці, якая тут, у Мінску, дамовілася», — дадаў ён. Беларускі лідар звярнуў увагу: у Беларусі цэняць, што мінскую пляцоўку для перагавораў выбралі «нават тыя, хто нас да ўпор ніколі не разглядаў».

Аляксандр Лукашэнка разлічвае на палітычную волю Злучаных Штатаў у нармалізацыі адносін паміж нашымі краінамі. Ён звярнуў увагу, што мэтанакіраваная работа па пошуку агульных інтарэсаў са Злучанымі Штатамі Амерыкі праз рэалізацыю праектаў у сферы эканомікі пачала ўжо даваць першыя адчувальныя вынікі.

На думку беларускага лідара, шлях да нармалізацыі адносін з ЗША ляжыць праз раўнапраўнае канструктыўнае супрацоўніцтва. «І я рады, што нарэшце ў Амерыцы гэта зразумелі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

## СТРАТЭГІЧНАЕ ПАРТНЁРСТВА І АДКРЫТАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

Беларусь заўсёды будзе поплеч са сваім стратэгічным саюзнікам — з Расіяй, адзначыў Прэзідэнт. «І Еўрасаюз, і ЗША мяне разумеюць, калі я ім кажу: «Вы павінны ведаць, калі, не дай Бог, што здарыцца, Беларусь будзе плячо ў плячо з Расіяй. Гэта наш саюзнік». Прыводжу прыклад: помніце, як у Іраку бамбілі? Нібыта знайшлі ядзерную зброю і павесілі Садама Хусейна. Увесь свет ведаў, што гэта несправядліва, няправільна робяць Злучаныя Штаты Амерыкі. Але ўся Еўропа і натаўскія краіны выстраіліся адна за адной і падтрымлівалі Амерыку, таму што яны саюзнікі. Усе павінны ведаць: мы былі з Расіяй разам і заўсёды будзем. І ніякіх пустых размоў у сувязі з Крымам, пра нібыта нейкі крэн Беларусі і павароты кудысьці, не павінна быць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў Прэзідэнт, у Расіі ёсць сілы, якія «вельмі хочуць абмежаваць уплыў беларускай мадэлі развіцця і таго ж Лукашэнкі на працэсы, што адбываюцца ў Расійскай Федэрацыі». «Такіх людзей нямала, і яны пачынаюць нас ціснуць ва ўсіх напрамках. Не звяртайце на гэта ўвагі, яно пройдзе. Некаторыя пачынаюць пад'юджваць: маўляў, Лукашэнкі не будзе 9 мая ў Маскве на парадзе, ён нібыта, каб дагадзіць Захаду, так зробіць з прыцэлам на прэзідэнцкія выбары. Якое глупства! Мы з кіраўніцтвам Расіі выразна дамовіліся: у свеце засталося дзве краіны, якія свята шануюць Вялікую Перамогу. Мы дамовіліся: у Беларусі свой парад і ўрачыстыя мерапрыемствы, таму Прэзідэнт павінен быць 9 мая ў краіне са сваім народам. І замяніць яго ў гэтым ніхто не можа, галоўнакамандуючы павінен прымаць парад. У Маскву мы прыедзем 8 мая і, як мае быць, адзначым свята Перамогі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.


Фота БЕЛТА.

«Расія як была, так і застаецца нашым галоўным стратэгічным партнёрам. Супрацоўніцтва з ёю развіваецца паступальна, дынамічна. Беларуска-расійскія адносіны ў рамках Саюзнай дзяржавы знаходзяцца сёння на якасна высокім узроўні — на тым, якога мы не дасягнулі ні ў якім іншым інтэграцыйным аб'яднанні. Стварэнне сумеснай канкурэнтаздольнай прадукцыі за кошт аб'яднання прамысловага, фінансавага і маркетынгавага патэнцыялаў умацуе нашы пазіцыі на міжнародных рынках і дасць магчымасць годна канкурыраваць з трэцімі краінамі. Расія да гэтага гатова», — сказаў Прэзідэнт.

Ён таксама адзначыў, што неад'емнай часткай нашай стратэгіі з'яўляюцца далейшае нарошчванне ўзаемадзеяння з рэгіёнамі Расіі, умацаванне і прымнажэнне напрацаваных сувязяў з імі.

Гаворачы пра ўдзел Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Нашы апаненты палохаюць нас тым, што, увайшоўшы ў гэтае інтэграцыйнае аб'яднанне, Беларусь страціць сваю незалежнасць. Такія сцвярджэнні цалкам беспадстаўныя. Вы гэта бачыце».

«Мы зыходзім з таго, што рэгіянальная эканамічная інтэграцыя з'яўляецца адным з ключавых фактараў павышэння ўстойлівасці нацыянальнай эканомікі ва ўмовах нестабільнасці сусветнай эканамічнай сістэмы. Менавіта ў такім ключы і выбудоўваем сваю дзейнасць у Еўразійскім эканамічным саюзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што ўдзел Беларусі ў еўразійскіх інтэграцыйных працэсах у якасці краіны-заснавальніка дае вялікія перавагі. «Мы атрымалі эканамічныя дывідэнды — я не буду іх пералічваць. Вядома, атрыманне пераваг у ЕАЭС звязана і з непазбежным узмацненнем канкурэнцыі для нашых прадпрыемстваў, неабходнасцю іх адаптацыі да ўмоў больш адкрытай эканомікі. Калі падпісваўся дагавор, мы адзначалі, што беларускі бок будзе ўважліва сачыць за ходам рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцей, за дынамікай ліквідацыі выключэнняў у рамках пераходных перыядаў. Час паказаў правільнасць такога падыходу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт лічыць рэальным збліжэнне Еўрасаюза і Еўразійскага эканамічнага саюза. «Нягледзячы на сённяшняе абвастрэнне геапалітычнага становішча, лічу, што наша ідэя інтэграцыі інтэграцый па-ранейшаму актуальная і перспектыўная. У рэшце рэшт мы прыйдзем да рэальнага збліжэння Еўрасаюза і Еўразійскага эканамічнага саюза, да пабудовы Вялікай Еўропы ад Атлантыкі да Ціхага акіяна. Ажыццяўленню гэтай ідэі садзейнічае старшынства Беларусі ў ЕАЭС», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Наша агульная задача — пазбегнуць новых раздзяляльных ліній у Еўропе, выкарыстоўваць патэнцыял канструктыўнага ўзаемадзеяння на карысць нашых народаў», — дадаў ён.

## «ХВАРОБЫ» ГРАМАДСТВА ТРЭБА ЛЯЧЫЦЬ

Закрануў Прэзідэнт у Пасланні і заганы, якія хвалююць грамадства, — сацыяльнае ўтрыманства, наркаманію, карупцыю.

«Сёння нельга не бачыць і сур'ёзнай небяспекі для здаровага ладу жыцця, з якой сутыкаецца сучаснае грамадства. Такія беды, як наркаманія, — не наша вынаходства, алкагалізм і курэнне не толькі наносяць шкоду здароўю людзей, але і ўяўляюць пагрозу генафонду нацыі. Іх неабходна рашуча выкараняць у імя дабрабыту нашага народа. Небяспека ў тым, што кантынгент, які спажывае наркотыкі, маладзее: у яго ўваходзяць школьнікі, навучэнцы прафтэхвучылішчаў і студэнты ВНУ. Трэба ўсім — ад выкладчыкаў да міліцыянераў — гарачым жалезам выпальваць гэтую заразу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што ў першую чаргу грамадства павінна быць нецярпіма да распаўсюджвальнікаў наркотыкаў. Да тых, хто на слабасці людзей і страце здароўя робіць грошы. «Яшчэ больш масавая праблема — алкагалізм. Беларусь адносіцца да групы краін з высокім узроўнем спажывання алкаголю. Асобамі ў нецвярозым стане ўчыняецца амаль 40 працэнтаў усіх злачынстваў, яны — частыя вінойнікі дарожна-транспартных здарэнняў», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што патрабуюць урэгулявання пытанні размяшчэння сацыяльнай рэкламы ў месцах рэалізацыі алкагольных напояў і піва. Разам з тым, на думку кіраўніка дзяржавы, павышэнне ўзроставага цэнзу для пакупнікоў алкагольных напояў не вырашыць праблему.

«Што датычыцца сацыяльнага ўтрыманства, то тут трэба падыходзіць прадумана, з улікам усіх узнікаючых пытанняў», — падкрэсліў Прэзідэнт. Большасць грамадзян выконвае свой канстытуцыйны абавязак: працуе і плаціць падаткі. «У нас, як улады, няма ніякіх прэтэнзій да такіх людзей. Аднак некаторая частка працаздольных людзей не прымае ўдзелу ў фінансаванні дзяржаўных расходаў. Пры гэтым сацыяльнымі дабротамі карыстаюцца ўсе на аднолькавых правах. З пункту гледжання большасці людзей, такі падыход несправядлівы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«З мэтай забеспячэння выканання канстытуцыйнага абавязку грамадзян удзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў па маім даручэнні распрацаваны і прыняты дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што ў адрас дэкрэта гучыць шмат крытыкі. «Баюся, мы штосьці недапрацавалі. Я ўжо даручыў Адміністрацыі і прашу распрацоўшчыкаў (дэкрэта. — **Заўвага БЕЛТА**): унікніце ў кожную заўвагу, нават калі іх выказваюць нейкія шарлатаны ад палітыкі. Вывучайце, паглядзіце, бо нам не пакрыўдзілі нармальнага чалавека, — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. — Мы не павінны дапусціць ніводнай памылкі. Інакш добрую справу пахаваем».

«Абноўлены закон аб барацьбе з карупцыяй павінен запрацаваць у найбліжэйшы час», — сказаў Прэзідэнт. «Хацелася б, каб і ў другім чытанні мы маглі аператыўна прыняць гэты закон», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт папрасіў парламентарыяў, каб гэты дакумент не быў выпустошаны. Я вас пераканаўча аб гэтым прашу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гэты законапраект атрымаў шырокі рэзананс. «Ён падрыхтаваны з улікам вынікаў яго грамадскага абмеркавання. Ведаю, што было больш за 300 прапаноў і заўваг», — сказаў Прэзідэнт.

## ДЫЯЛОГ, А НЕ ПЛОШЧА

«Праблемы трэба абмяркоўваць у парламенце, а не на плошчы», — заявіў Прэзідэнт. «Беларускі парламент з'яўляецца галоўнай пляцоўкай для дыялогу, на якой прадстаўнікі розных слаёў грамадства могуць абмяркаваць актуальныя для краіны пытанні», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да старшынь абедзвюх палат Нацыянальнага сходу, Аляксандр Лукашэнка заклікаў запрашаць у парламент людзей з рознымі пунктамі гледжання. «Абмяркоўвайце праблемы, выпрацоўвайце тыя або іншыя рашэнні, уносьце прапановы. Я заўсёды гатовы выслухаць вас», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт дадаў, што ўвогуле парламентарыям неабходна больш актыўна ўзаемадзейнічаць з дзяржорганамі, грамадскімі аб'яднаннямі і бізнес-супольнасцю.

«Наш парламент сфарміраваўся як сталы і прадстаўнічы орган, які займае годнае месца ў сістэме ўлады», — таксама адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў наступным годзе Нацыянальнаму сходу споўніцца 20 гадоў. За гэты час, як лічыць Аляксандр Лукашэнка, удалося стварыць устойлівы прававы фундамент беларускага грамадства і сфарміраваць нацыянальную сістэму заканадаўства. «У той жа час агульнасусветныя сацыяльна-эканамічныя працэсы і роля ў іх Беларусі ставяць перад дэпутацкім корпусам на сучасным этапе шэраг новых задач», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што неабходна пастаянна працаваць над павышэннем якасці падрыхтоўкі законапраектаў і дакладнасцю прагнозаў наступстваў іх прыняцця: «Перш чым прымаць закон, неабходна падлічыць, да якіх наступстваў гэта прывядзе. А ў нас, на жаль, вельмі часта бывае наадварот. Спачатку вырашаем нешта змяніць, але потым разумеем, што гэта было лішнім і прынесла больш шкоды, чым карысці».

«Вельмі вас прашу — усе органы ўлады, парламент, дэпутатаў: ніколі не адмаўляйцеся ад дыскусій з самымі крайнімі нашымі апазіцыянерамі, нават членамі пятай калоны, як мы іх называем. Куды ад іх падзецца? Яны ёсць у нашым грамадстве, яны грамадзяне нашай краіны, — сказаў Прэзідэнт. — Не ўхіляйцеся ад гэтых дыскусій, кантактуйце з гэтымі людзьмі... Трэба з імі размаўляць». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што далёка не ўсе апазіцыянеры жадаюць нашкодзіць краіне. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы лічыць, што пэўная частка апазіцыі зразумела, што такое стабільнасць і мір.

«Нам канфрантацыя ўнутры краіны абсалютна не патрэбна, таму трэба размаўляць з усімі», — яшчэ раз падкрэсліў Прэзідэнт. Таксама, на яго думку, апошнім часам намецілася станоўчая тэндэнцыя ўзмацнення ролі канструктыўных грамадскіх арганізацый у фарміраванні грамадзянскай супольнасці Беларусі, станаўленні дэмакратыі, абароне правоў і свабод грамадзян.

«Беларуская палітычная сістэма даказала сваю эфектыўнасць. Яркай характэрнай яе рысай з'яўляецца прамое народаўладдзе. Мы выступаем за тое, каб у Беларусі былі прадстаўлены розныя палітычныя погляды. Заканадаўства прадугледжвае ўсе магчымасці для стварэння і работы палітычных партый. Было б толькі жаданне ўсім гэтым наборам опцый карыстацца з карысцю для грамадства і краіны», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуў увагу Прэзідэнт і на ролю СМІ ў грамадстве. «У сучасным свеце, дзе роля і ўплыў СМІ ўвесь час нарастае, недазвольнай раскошай для любой дзяржавы з'яўляецца недаацэнка іх уплыву на грамадства. Беларусі не ўдасца застацца ўбаку ад гэтых глабальных працэсаў. Мы вымушаны па-новаму паглядзець на існуючую сістэму абароны сваёй інфармацыйнай прасторы. Яна павінна быць гібкай, адпавядаць усім патрабаванням часу», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, першачарговая задача — засцерагчы грамадзян ад выкарыстання ў адносінах да іх маніпуляцыйных тэхналогій, не парушыўшы пры гэтым канстытуцыйнага права на атрыманне інфармацыі. «Адначасова неабходна павышаць ролю СМІ ў фарміраванні пазітыўнага іміджу нашай дзяржавы на сусветнай арэне. У гэтым пытанні ў нас доўгі час былі істотныя недапрацоўкі і іх неабходна выкараняць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Унутранае і знешняе становішча вакол Беларусі настойліва патрабуе актывізацыі ідэалагічнай работы. «У цяперашніх умовах асаблівую каштоўнасць набывае аператыўная і дакладная інфармацыя, адкрытая размова ідэалагічнага актыву з людзьмі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1–3-й стар.)

# ДЗЕЛЯ НАРОДА

## ТАЛЕРАНТНАСЦЬ І СУВЕРЭНІТЭТ

Беларусь не будзе праводзіць дзікую нацыяналістычную палітыку, заявіў Прэзідэнт. «У вельмі многіх у Беларусі руская кроў перамяшана з беларускай, польскай, яўрэйскай і гэтак далей. Мы ніколі не звярталі і не будзем звяртаць на гэта ўвагу. Нам людзей не хапае ў краіне, нам неабходна мець мінімум 20 млн насельніцтва. Навошта ж мы будзем праводзіць дзікую нацыяналістычную палітыку? Каб выгнаць з беларускай зямлі людзей, якія тут нарадзіліся або нарадзіліся іх бацькі? Гэта глупства несусветнае!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што апошнім часам шмат гавораць пра ідэю нейкага «рускага свету». «Я так разумею, што гэта не пра нас. Ведаеце, часта гавораць: слухай, ты чаго, мы ж рускія людзі... Гэта не значыць, што мы расіяне. Мы, беларусы і расіяне, — рускія людзі, так у нас склалася. Але аб гэтым «рускім свеце» хачу сказаць адкрыта наступнае. Беларусь першай на постсавецкай прасторы надала рускай мове статус дзяржаўнай нараўне з беларускай. Мы высока цэнім вялікую рускую культуру і не аддзяляем яе ад нашай, мы частка гэтай культуры», — сказаў Прэзідэнт, растлумачыўшы, што гэта тэма ўзнікла ў тым ліку ў сувязі з «пытаннем, якое хвалюе не толькі простых лібералаў у Расіі, але і нават частку расійскага кіраўніцтва: маўляў, Беларусь узяла нейкі крэн на Захад». «Хіліцца мне няма куды. І мне сёння гавараць аб тым, што я, прабыўшы 20 з лішнім гадоў Прэзідэнтам у гэтай краіне, кудысьці нахіліўся, — гэта глупства. Выкіньце гэта з галавы, паважаныя расіяне. Мы вашы браты, мы заўсёды былі разам. Але дазвольце нам мець свой пункт гледжання і свае ўражанні аб свеце».

«Трэба разумець: Беларусь — суверэнная незалежная дзяржава. Зразумела, мы вельмі цесна звязаны з рускім народам, мы браты, але мы хочам жыць у сваёй кватэры ў адным шматпавярховым доме», — дадаў Прэзідэнт.

## СПАКОЙНА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

«Вялікія магчымасці і энергія моладзі павінны быць накіраваны на карысць грамадства», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Нам удалося дасягнуць прыкметнага паляпшэння сацыяльна-эканамічнага становішча маладога пакалення. Значна вырас яго адукацыйны ўзровень. Вельмі важна, каб маладыя людзі ўдзельнічалі ў развіцці грамадства, вучыліся жыць па яго законах — праўвых і маральных, станавіліся сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пабочных наглядальнікаў у гэтым важным працэсе не павінна быць. «Маладзёжныя арганізацыі, сістэма адукацыі, навука, культура і мастацтва, працоўныя калектывы і органы ўлады — усё павінна быць пранізана выхаваўчымі функцыямі, — сказаў ён. — Усяму нашаму грамадству трэба больш прыцягваць моладзь да розных сфер дзейнасці, развіваць яе творчы патэнцыял». «Мы павінны дамагчыся таго, каб кожны малады чалавек, які жыве ў Беларусі, быў упэўнены, што ён патрэбны сваёй краіне, што менавіта тут ён зможа рэалізаваць свае планы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Закранаючы тэму развіцця нацыянальнай культуры, Прэзідэнт падкрэсліў: «Нам вельмі патрэбны высокага ўзроўню літаратура, жывапіс, спектаклі, кінафільмы, дзе было б таленавіта паказана жыццё нашай маладой суверэннай дзяржавы. Сёння так не хапае твораў, якія фарміруюць і падтрымліваюць духоўных каштоўнасці нашага народа, якія аб'ядноўваюць людзей, засцерагаюць іх ад хлусні, амаральнасці і бескультур'я. Мы ўкладваем вялікія грошы ў маладыя таленты і ў творчых людзей, якія маюць дастатковы вопыт. Але жаданай аддачы пакуль няма».

Беларускі лідар адзначыў, што глядач стаміўся ад сумнеўнай кінапрадукцыі і будзе з задавальненнем глядзець добрыя карціны, слухаць вартыя песні. Сёння ёсць шмат кінапрадукцыі расійскай вытворчасці, прычым часта створанай у Беларусі, але нашай краіне час зрабіць свой уклад.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, трэба актывізаваць творчыя саюзы, каб яны нацэльвалі дзеячаў мастацтва на плённую працу, арыентавалі на высокі эстэтычны ўзровень і процістаялі пошласці і бездухоўнасці.

Ён таксама адзначыў, што сродкам масавай інфармацыі трэба больш надаваць увагі мастацкім творам, якія ўваходзяць у скарбніцу нацыянальнай, агульнаеўрапейскай і сусветнай культуры і мастацтва. «Комплекснае вырашэнне задач у сацыяльна-культурнай сферы павінна быць нацэлена на фарміраванне працавітай, адукаванай, культурнай і здаровай нацыі. Гэта залог дабрабыту краіны як сёння, так і ў будучыні», — сказаў Прэзідэнт.

І немалая роля тут адводзіцца спорту. «Мы па праве ганарымся перамогамі нашых спартсменаў на Алімпійскіх гульнях і іншых прэстыжных чэмпіянатах. Хаця вы бачыце, што адбываецца ў гульнявых відах спорту. Спорт — гэта дух нацыі, і яго трэба ўсяляк падтрымліваць на самым высокім узроўні», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

У рэгіёнах краіны ўводзяцца сучасныя спартыўныя аб'екты, разгорнута шырокамаштабная работа па ўмацаванні іх матэрыяльнай базы, развіваецца айчынная фізкультурна-спартыўная індустрыя. Аднак беларускі лідар лічыць, што масавую фізічную культуру ў краіне яшчэ трэба развіваць.

«У Беларусі можна спакойна жыць і працаваць», — запэўніў Прэзідэнт. «Вы павінны быць спакойныя: мы сёння маем планы ў выпадку абвастрэння сітуацыі паднiяць і ўзброіць паўмільёна беларусаў. І гэта дастатковая сіла, каб процістаяць любым задумам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разам з адкрытай, шматвектарнай, міралюбівай палітыкай у краіне не забываюцца і пра бяспеку. «Трэба заўсёды быць пільнымі. І ў гэтых умовах адказнасць сілавога блока, праваахоўных структур за забеспячэнне стабільнасці і правапарадку ў грамадстве шматразова ўзрастае. Міжнароднае становішча абавязвае нас умацоўваць абараназдольнасць Беларусі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што найважнейшай знакавай падзеяй 2015 года з'яўляецца 70-годдзе Вялікай Перамогі, лёсавызначальнае значэнне якой неаспрэчна для беларускага народа. «Менавіта тады былі заваяваны мір, незалежнасць і закладзены фундамент для развіцця нашай дзяржавы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Неўміручая слава героя-пераможцаў, гордасць за іх з'яўляюцца непахіснымі апорамі нашай нацыянальнай самасвядомасці. Сённяшняя памяць аб Перамозе стала той духоўнай сілай, якая аб'ядноўвае нас у адданай любові да Радзімы».

«Давайце будзем усе разам берагчы яе, каб перадаць дзецям і ўнукам мірную, свабодную, квітнеючую краіну. Захаваем адзінства, спакой і згоду ў нашым агульным доме, іншага ў нас няма і не будзе», — заявіў беларускі лідар.

«Упэўнены, мы зробім усё, каб забяспечыць для Беларусі мір, незалежнасць і дынамічнае развіццё!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

**Па матэрыялах БЕЛТА.**

# ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

**Пасля звароту да парламента і народа Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні прадстаўнікоў найвышэйшага заканадаўчага органа краіны.**

● Тэму падатковых ільгот закрануў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Мікалай КАЗАРАВЕЦ**.

«Скарачаць ільготы і падтрымку прадпрыемствам мы абавязкова будзем, — адказаў яму Прэзідэнт. — У якім аб'ёме — гэта жыццё павінна будзе паказаць. Дэпутатам і ўраду неабходна вызначыць, якія пакінуць падатковыя льготы. Калі вы дамовіцеся, то нават умешвацца ў гэтую праблему не будуць». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што скарачаць цяпер існуючыя сацыяльныя льготы не плануецца — дзяржава падтрымлівала і будзе падтрымліваць людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе. «Што тычыцца прадпрыемстваў, то марных выдаткаў быць не можа», — сказаў Прэзідэнт.



Фота БЕЛТА

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што льготы могуць быць прадастаўлены пад акупныя інвестыцыйныя праекты. «Нам Кітайская Народная Рэспубліка выдзеліла ў агульнай масе крэдытаў на $ 15 млрд. Але сёння жорсткі падыход да адбору тых, хто прэтэндуе на гэтыя крэдыты. І мы не можам іх выбраць, таму што нас нiхто не можа перакануць у акупнасці і выгадзе таго ці іншага праекта. Будзе добры праект — і льготы дадзім, але гэта індывідуальна», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

● **На пытанне намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Зінаіды МАНДРОЎСКАЙ** пра дзяржаўную дапамогу ў пагашэнні банкаўскай запазычанасці беларускімі прадпрыемствамі Аляксандр Лукашэнка адказаў, што такая дапамога будзе аказвацца кропкава. «Мы разглядаем індывідуальна кожнае прадпрыемства. І калі бачым, што яно «варушыцца», але з-за аб'ектыўных умоў ёсць цяжкасці, мы, вядома, такому прадпрыемству дапаможам», — паабяцаў кіраўнік дзяржавы. «Пры гэтым, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, — прамысловыя прадпрыемствы не павінны думаць, што дзяржава будзе плаціць за іх крэдыты. Тэтага не было і быць не можа».

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Людміла МІХАЛЬКОВА** спытала пра магчымасць амністыі для асуджаных па эканамічных злачынствах. Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што такая амністыя магчымая. Але Прэзідэнт заўважыў, што гэтая мера не павінна прымяняцца да ўсіх. «Вы ведаеце маё стаўленне да эканамічных злачынстваў, асабліва калі там папахвае карупцыяй. Тут мы на гэта ісці не павінны. Але ёсць эканамічныя злачынствы, дзе чалавек кампенсаваў шкоду, можа быць, нават не ў аднакратным памеры», — выказаў сваё меркаванне Аляксандр Лукашэнка.

● **Леанід КАВАЛЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве**, спытаў Прэзідэнта пра перспектывы забеспячэння жыхароў Беларусі, асабліва ў сельскай мясцовасці, пітной вадой. На гэта кіраўнік дзяржавы адказаў, што ў нашай краіне распрацоўваецца Дзяржаўная праграма па водазабеспячэнні і водаадвядзенні «Чыстая вада» на 2016-2020 гады. «І я гарантую, што ў наступнай пяцігодцы мы забудзем аб гэтай праблеме», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што некалькі гадоў таму магчымыя шляхі вырашэння праблем па водазабеспячэнні і водаадвядзенні абмяркоўваліся ў дачыненні да пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнаў Гомельскай вобласці. Потым гэтыя напрацоўкі былі пакладзены ў аснову агульнадзяржаўнай праграмы. «Зроблена ўжо нямала, але ўсё ж такі ёсць цяжкія месцы, дзе трэба, можа быць, больш сур'ёзна паставіцца, нешта паправіць», — лічыць беларускі лідар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Меркаванні

# Правільная расстаноўка акцэнтаў

**Кіраўнік дзяржавы ў сваім Пасланні закрануў розныя сферы — ад эканомікі і знешняй палітыкі да культуры і аховы здароўя. Дэпутаты падзяліліся сваімі ўражаннямі ад выступлення Прэзідэнта.**

**Віталь БУСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:**

— Па-першае, трэба сказаць, што Прэзідэнт выступаў не з нейкімі дырэктывамі, але раіўся з народам. Па-другое, ён вельмі выразна сказаў, што нельга замоўчваць праблему. Агучаная, вызначаная праблема — ужо напалову вырашаная. Было сказана, што найвышэйшая мэта любога палітыка — гэта дабрабыт народа. Усё, што робіцца ў краіне, усё, што будуецца, — для людзей. У той жа час Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што народ сам з'яўляецца будаўніком свайго шчасця. Да нас не прыйдуць ні багатыя кітайцы, ні багатыя амерыканцы, пакуль мы самі не пачнём працаваць якасна, адказна выконваць свае абавязкі.

Мне, як міжнародніку, спадабалася частка выступлення, прысвечаная міжнародным адносінам, інтэграцыйным працэсам. Зварот да канцэпцыі інтэграцыі інтэграцый, мне здаецца, зараз актуальны, таму што, сапраўды, наш Еўразійскі эканамічны саюз працуе яшчэ няшмат, але ўжо ёсць вынікі. І калі мы станем партнёрамі з Еўрапейскім саюзам, гэта канцэпцыя стане рэальнасцю.

**Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы:**

— Пагадзіцеся, тэма культуры — вельмі важная. Добра, што яна сёння так прагучала, бо чалавек культурны, адукаваны будзе прафесіяналам сваёй справы і будзе жыць і працаваць так, каб Беларусь станавілася прыгожай, высокакультурнай еўрапейскай дзяржавай. Тыя задачы, якія пастаўлены Прэзідэнтам у галіне культуры, абсалютна выканальныя. Для гэтага неабходна жаданне, якое ў нас ёсць, і пераарыентацыя пэўных напрамкаў — яны ўжо вызначаны.

**Святлана ШЫЛАВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:**

— Мяне вельмі радуе пасыл у звароце кіраўніка дзяржавы да ўсіх нас: сёння неабходна мець актыўную жыццёвую пазіцыю, працаваць і ўзнімаць сваю краіну. Радуе, што высокая адзнака дадзена нашай сістэме аховы здароўя. А паколькі я прадстаўляю медыцынскую навуку, у мінулым урач-практык, думаю, нашы медыцынскія работнікі будуць вельмі ўдзячны Прэзідэнту за цёплыя словы і яшчэ лепш будуць працаваць над умацаваннем здароўя нашага насельніцтва.

**Тацццяна КАНАНЧУК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:**

— Штогадовыя пасланні Прэзідэнта парламенту і беларускаму народу заўсёды адметныя канкрэтнымі пастаноўкамі задач, як рашаць сённяшнія праблемы і, натуральна, даюць арыенціры на перспектыву. Таму ёсць шмат прапаноў па эканоміцы — гэта самы галоўны кірунак для далейшага развіцця нашай краіны. Яны ідуць ад жыцця і гэта, сапраўды, шэраг правільных дзеянняў, якія дазволяць краіне выйсці на больш высокі ўзровень развіцця.

**Інэса КЛЯШЧУК, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве:**

— Для мяне цікава тэма моладзі. Ужо неаднаразова з вуснаў Прэзідэнта гучала, што сёння неабходна выхоўваць актыўнага маладога чалавека, грамадзяніна сваёй краіны і патрыёта. Другое, што асабліва прыцягнула маю ўвагу, — былі пастаўлены канкрэтныя задачы для парламента. І канструктыўны дыялог з усімі грамадскімі аб'яднаннямі, у тым ліку з выканаўчай уладай, для таго, каб выпрацоўваць сумесныя рашэнні, і выкарыстанне парламенцкай дыпламатыі, і выпрацоўка такіх законаў, якія былі б зразумелыя. Прэзідэнт адзначыў, што сёння ўжо створана дастаткова трывалая прававая база і яе проста трэба далей удасканальваць, каб яна адпавядала рэаліям нашага жыцця. Таму я для сябе вызначыла гэтыя задачы.

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах:**

— Прэзідэнт абсалютна правільна расставіў прыярытэты. Вы заўважылі, што больш за палову звароту да народа і парламента займаў блок эканамічных пытанняў — тых, якія, несумненна, сёння трывожаць усіх. Была вызначана роля знешніх фактараў у эканамічных праблемах і, у той жа час, выразна акрэслены ўсе ўнутраныя фактары. Некалькі разоў Прэзідэнт прамовіў слова «маркетынг». Для мяне гэта знакава, я знаёмы з гэтай сферай. Натуральна, гэта тая канцэпцыя, якая кажа нам: мы нічога не павінны выпрабляць без патрэбы, гэта значыць, тавар павінен задавальняць пэўны попыт. Тады і не будуць узнікаць лішнія складскія запасы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

# І ПАДПАЛІЛІ... РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

**Калі размаўляеш са сведкамі тых трагічных падзей, чытаеш іх успаміны, міжвольна ўзнікае пытанне: людзі ўчынялі тое жудаснае ці звяры?! У Беларусі тысячы вёсак былі спалены, многія — разам з жыхарамі. Пра іх, гэтых «сясцёр» Хатыні, трэба пісаць. Каб нашчадкі памяталі, каб быў «аргумент з першых вуснаў» для тых, хто спрабуе перапісаць гісторыю гэтай страшнай вайны. З кожным годам усё менш застаецца тых, хто выжыў у «вогненных вёсках». Сваімі ўспамінамі, напоўненымі жудаснымі падрабязнасцямі, іх былыя жыхары дзеляцца з болем у сэрцы. На такое ніколі не забыцца.**



Дзве сястры — сведкі трагедыі (злева Лілія Прохараўна Саўчанка-Вілк, справа — Валянціна Прохараўна Саўчанка).

## «ГРЭЛІСЯ Ў ГНАЯВОЙ ПАЦЯРУСЕ»

Жыхар Гарадоцкага раёна **Міхаіл Яфімавіч Чубараў** расказаў пра зверствы акупантаў і іх памагатых. Мужчына, дарэчы, жыве непадалёк ад месцаў, дзе адбыліся трагічныя падзеі. Калі слухаеш яго, міжвольна мурашкі бягуць па спіне...

— Я нарадзіўся ў ліпені 1932 года. Падчас акупацыі разам з малодшай сястрой Валяй, братам Жэнем і мамай жылі ў вёсцы Пунішча. Вёску нашу восенню 1943 года спалілі дашчэнту. Знішчылі і суседнюю Шахі, якая прыблізна ў двух кіламетрах. Там жылі дзядуля і бабуля. Спальвалі ворагі ўсё, што траплялася ім на вочы. Гарэлі дамы, гаспадарчыя пабудовы, стагі сена і іншае... Немец стараўся пакінуць пасля сябе літаральна пустыню, выпаленую зямлю, — распавядае Міхаіл Яфімавіч.

Калі ён са сваякамі схаваўся ад карнікаў у лесе, іх знайшлі. Людзей пагналі ў бок вёскі Высачаны. Адтуль сагналых пад канвоем павялі ў заходнім напрамку.

— Але перад гэтым праводзілася так званая «фільтрацыя». Падлеткаў і юнакоў адпраўлялі рыць акопы, траншэі. А тых, хто старэйшы, гналі ў Германію. Мы (трое малых, мама наша і бабуля з дзядулем) таксама былі ў «канвойнай калоне». Гналі нас спачатку ў бок Оршы, а потым па дарозе Масква — Мінск... Начавалі звычайна пад адкрытым небам. Здаралася, заганялі ў паўразбураныя гаспадарчыя пабудовы, унутры якіх з усіх бакоў дзьмулі вятры. Пры гэтым некаторым шанцавала, бо можна было сагрэцца, зарыўшыся ў гнаявой пацярусе. Сястрычка Валя і брацік Жэня цяжка захварэлі: у іх была высокая тэмпература. Вядома, пра медыцынскую дапамогу і марыць не даводзілася. Памятаю, мама са слязьмі на вачах сказала: «Калі не збяжым, яны памруць!..» Раніцай пад покрывам туману мы збеглі. Знайшлі часовы прытулак на тэрыторыі былога Талачынскага льнозавода.

Маці здолела выратаваць дзяцей ад смерці. Паводле слоў Міхаіла Яфімавіча, дзень 26 чэрвеня 1944 года яму запомніўся на ўсё жыццё. Тады тыя, хто выжыў, убачылі сваіх вызваліцеляў.

— А да гэтага былі тры горкія і цяжкія гады, што аднялі дзяцінства. Гады, якія пазбавілі жыцця многіх людзей, — дадаў сведка трагедыі «вогненных вёсак».

## «ТОЙ ЖАХ НЕ АПІСАЦЬ!»

Падчас карнай аперацыі ў пачатку сакавіка 1943 года ворагі знайшлі вяскоўцаў у адным з дамоў, распавядае **Віктар Васільевіч Альшэўскі** з Верхнядзвінска. Там старыя, жанчыны і дзеці спадзяваліся «перасядзець» і выратавацца. Пагналі людзей у бок вёскі Ганчарова. Карнікі раптам зліталаваліся: сказалі пажылым і старым, што па іх прыедуць падводы. Маўляў, вашы сваякі пойдуць далей, а вы пачакайце. Калі людзі адмовіліся, іх сагналі ў хлеў, зачынілі дзверы і падпалілі...

— Астатніх пагналі на чыгуначную станцыю ў Верхнядзвінск, каб потым адправіць у канцлагер. І мы бачылі, як гарэў хлеў, а ў ім жывыя людзі. Сярод тых, каго спалілі, была мая мама Ефрасіння Рыгораўна, якая нарадзілася ў 1890 годзе, мая цётка Анэта і яшчэ больш за дзесяць чалавек... Па дарозе ў Верхнядзвінск некалькі людзей з калоны застрэлілі. Я з чыгуначнай станцыі ўцёк ад фашыстаў, — успамінае мужчына.

— Я нарадзіўся ў маі 1937 года. У гады Вялікай Айчыннай вайны наша сям'я жыла ў вёсцы Паўлючы. Бацька памёр у 1942 годзе. У сям'і засталіся я, мая маленькая сястра, мама і бабуля, — узгадвае **Станіслаў Пятровіч Садоўскі**, які жыве ў Пастаўскім раёне. У кастрычніку 1943 года падчас блакады партызан фашысты прыехалі ў нашу вёску, каб яе спаліць. Мы чулі, што акупанты паляць вёскі разам з людзьмі. Таму было вельмі страшна. Нават дарослыя плакалі, не гаворачы пра нас, падлеткаў. І праз дзясяткі гадоў мне цяжка апісаць, што мы адчувалі тады, у якім жаху былі!

Паводле слоў Станіслава Пятровіча, фашысты абышлі ўсе дамы і загадалі выгнаць хатнюю скаціну на вуліцу, а людзям — сабрацца ў цэнтры вёскі.

— Да натоўпу людзей пад'ехала павозка з кулямётам на возе. Людзі маўкліва стаялі ў чаканні самага страшнага. Праверылі спісы членаў сям'і, каб высветліць, ці не пайшоў хто ў партызаны. Потым маладых мужчын прымусілі гнаць кароў і авечак на станцыю Варапаева. Там ноч мы правялі на вуліцы — у парку на тэрыторыі былой панскай сядзібы. Было вельмі холадна, — дадае стары.

Раніцай немцы адабралі моладзь і працаздольных сем'і для адпраўкі ў Германію. А такіх, як Садоўскія, адпусцілі. Але дзе жыць, што есці?

— Усё наша было спалена: дом, свіран, ток, двое парасят, куры, адзенне, зерне... Але я выжыў! — расказвае Станіслаў Пятровіч.




Мемарыяльны комплекс у памяць вёскі Шунеўка, якая стала «сястрой» Хатыні.

## «ЛЯ ДАРОГІ ЛЯЖАЛІ ЗАБІТЫЯ ДЗЕЦІ»

Жыхарка Віцебска **Валянціна Прохараўна Саўчанка** памятае нават дробязі, у тым ліку і першых дзён вайны. А перад пачаткам вайны не было і 6 гадоў.

— А сястры маёй у 1941 годзе было ўсяго 3 гады, брацiку — каля 3 месяцаў. Жылі мы недалёка ад чыгуначнай станцыі Лосвіда (да яе ад Віцебскага чыгуначнага вакзала недалёка, станцыя функцыянуе і ў наш час. — **Аўт.**). Памятаю, калі на станцыю скінулі з самалёта першую бомбу, я збірала кветкі. А побач усё грукатала... Кіламетраў за сем ад нас, у вёсцы ў Гарадоцкім раёне, жылі маміны бацькі. Увечары па нас прыехаў дзядуля і на павозцы адвёз да сябе, — успамінае пенсіянерка.

— Па вёсках хадзіла шмат жабракоў. Памятаю, яны цалавалі бабулі рукі, калі яна давала бульбу або карміла чым-небудзь, — працягвае жанчына.

Яе бацька быў партызанам. Праўда, на пачатку вайны яна не ведала гэтага дакладна, бо ён прыходзіў у госці і знікаў. Памятае, як аднойчы немец уварваўся ў дом і прыставіў да галавы мамы, якая ў гэты час карміла немаўля грудзьмі, пісталет. Запытаўся: «Дзе камісар?» Яна маўчала. Цуд, што нечаканы госць не забіў яе...

Калі сям'я аказалася ў партызанскай зоне — недалёка ад Суража — дзяўчынка ўбачыла ў лесе павешанага партызана. Пасля гэтага не магла нармальна спаць — так напужалася. У лесе зрабілі шалашы, развялі вогнішчы. Але ў хуткім часе пачуліся стрэлы. Ніколі не забыцца, як свісталі кулі ля вушэй. Потым з'явіліся немцы і ўзялі людзей у палон.

— Калі сталі «сартаваць» нас, мяне пачало трэсці ад жаху. Павезлі кудысьці. Маладзенькага хлопца адарвалі ад яго мамы і расстралялі. І гэта ўсе бачылі. Потым доўга ехалі пад канвоем па лесе. Па баках дарогі ляжалі забітыя дзеці і дарослыя. Некаторыя забітыя дзеці сядзелі на санчках... Мы зноў апынуліся ў нашай вёсцы Баркова. Тады яшчэ не былі спалены ўсе дамы, — успамінае Валянціна Прохараўна.

Яна памятае, як тутэйшыя ўцякалі ад «чорнай хмары» (такім запомніўся «натоўп» немцаў у чорным форменным адзенні). Дарослыя з малымі дзецьмі на руках перайшлі раку праз мост, які адразу ўзарвалі партызаны. Раніцай здалёк было бачна зарава — гарэла вёска. Тых, хто не паспеў уцячы, спалілі ў лазні, іншых — расстралялі. І трупы ляжалі пад адкрытым небам, бо не было каму іх пахаваць.

***

У Віцебскім абласным музеі імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, супрацоўнікі якога дапамаглі зрабіць артыкул, збіраюць інфармацыю пра «вогненныя вёскі».

— Гэта — адзін з кірункаў нашай дзейнасці. У нас ёсць спісы, дзе каля 1,8 тысячы прозвішчаў тых, хто жыў у такіх вёсках або побач з імі. У музейным архіве ўжо больш за 100 рукапісных успамінаў. Каб адшукаць жыхароў «вогненных вёсак», давалі аб'явы ў газетах. Супрацоўнічаем і з раённымі музеямі і краязнаўцамі, якія збіраюць інфармацыю па тэме вайны. Канешне, было б добра з часам выдаць, хай і невялічкім накладам, зборнік успамінаў. Упэўнена, што гэта трэба зрабіць, — лічыць **дырэктар установы Ірына Шышкова**.

***

*На Віцебшчыне, у Докшыцкім раёне, ёсць мемарыяльны комплекс у памяць вёскі Шунеўка, якая стала «сястрой» Хатыні. Яна — сімвал усіх спаленых вёсак вобласці. Усяго на тэрыторыі сучаснага Докшыцкага раёна тры вёскі былі спалены разам з людзьмі (акрамя Шунеўкі, Азарцы і Залатухі). І яны не былі адноўлены. Сярод іншага на тэрыторыі мемарыяла можна ўбачыць калодзеж смерці. Побач з ім на пліце надпіс: «У гэты калодзеж фашысцкія каты жывымі кідалі дзяцей вёскі Шунеўка». Ля яго нават зімой можна ўбачыць свежыя кветкі і цацкі. Сюды прыязджаюць здалёк, каб пакланіцца памяці людзей, якія не былі ў чымсьці вінаватыя. Для акупантаў яны не ўяўлялі ніякай пагрозы. Але іх знішчылі!*

Памяць пра іх застанецца назаўсёды!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Сюды прыязджаюць здалёк, каб пакланіцца памяці нявінных ахвяр.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Западэлектросетьстрой» (Продавец) проводит повторный открытый аукцион со снижением цены**

## по продаже базы отдыха «Берег»,

**расположенной по адресу: Украина, Николаевская обл., Очаковский р-н, с. Черноморка, ул. Костенко, 77/1.**

Земельный участок площадью 1,1018 (кадастровый номер 4825184801:04:022:0004) передан ОАО «ЗАПАДЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ» в аренду по договору аренды земли от 13.09.2006 №040602100101, соглашение о продлении договора аренды земли от 10.10.2014 №040602100101 на 10 (десять) лет.

**Начальная цена без НДС – 51 556 долларов США.**
**Задаток без НДС – 2 578 долларов США. Шаг аукциона – 5%.**

Валюта торгов – доллар США. Валюта платежа – доллар США, российский рубль или белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь.
Задаток перечисляется на:
- р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369 (белорусские рубли);
- текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ОАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ОПЕРУ Москва, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM;
- р/с 3012232135083, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. 04-098-340, DEUTSCHE BANK TRUST CO. AMERICAS New York SWIFT код BKTRUS33 (доллары).

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «ЗАПАДЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ», проводимом 3 июня 2015 г.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 45 (сорока пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Обязанность по оформлению всех документов для заключения сделки купли-продажи Объекта, а также оплата расходов, связанных с оформлением сделки, возлагаются на Победителя аукциона (Претендента на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Украины.

**Аукцион состоится 03.06.2015 в 12.00 по украинскому времени по адресу: Украина, Николаевская обл., Очаковский р-н, с. Черноморка, ул. Суворова, 126, актовый зал.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:
- в Минске: в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 29.05.2015 в 10.00 по белорусскому времени;
- в с. Черноморка, ул. Суворова, 126, бухгалтерия (Украина, Николаевская обл., Очаковский р-н): 01.06.2015 с 12.00 до 17.00 по украинскому времени. Для этого потенциальному участнику необходимо не позднее 26.05.2015 до 12.00 по украинскому времени по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в с. Черноморка и представить копию платежного документа о перечислении задатка.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.10.2014.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация:**
**8 10 375 (17) 306-00-57, 8 10 375 (29) 356-90-03, 8 10 375 (29) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**
## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземной автостоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 1-комнатной квартиры № 307 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий – 1600 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США, и составит 1500 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

---

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**
## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3-комнатных квартир с машино-местом в подземном гараже-стоянке №№ 198, 206, 210 – 1500 долларов США.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения с машино-местом в подземном гараже-стоянке. Отдельно на перечисленные выше жилые помещения или на машино-места в подземном гараже-стоянке договоры создания объектов долевого строительства заключаться не будут.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 150 долларам США и составит 1350 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, кабинет № 105, непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

---

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**
## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 2-комнатных квартир с машино-местом в подземном гараже-стоянке №№ 231, 232, 298 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, – 1570 долларов США.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения с машино-местом в подземном гараже-стоянке. Отдельно на перечисленные выше жилые помещения или на машино-места в подземном гараже-стоянке договоры создания объектов долевого строительства заключаться не будут.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 150 долларам США, и составит 1420 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, кабинет № 105, непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

---

11.05.2015 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О результатах проведения дополнительного выпуска акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки на акции ОАО «ЭнКоСтрой».
2. Об утверждении решения о выпуске акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки.
3. Об изменении размера уставного фонда ОАО «ЭнКоСтрой».
4. О внесении и утверждении изменений в устав ОАО «ЭнКоСтрой».

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

Начало регистрации – 13.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания с 10.00 до 16.00, начиная с 04.05.2015 г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

УНП 191303197

---

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Везучий покупатель!»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «**Везучий покупатель!**» (далее – Игра или рекламная игра).

**1. Организатор рекламной Игры**

Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Налан» (УНП 100016050, зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Решением Мингорисполкома № 550 от 14.05.2001) (далее — Организатор).

Местонахождение Организатора: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 11/1-1а; почтовый и фактический адрес: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 3Н, тел.: (017) 222-00-28, факс (017) 376-86-29, e-mail: info@nalan.by (далее – Офис Организатора).

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры – 8-029-188-18-26, 8-033-300-10-56, городской (017)224-21-77.

**2. Наименование рекламной игры**: **«Везучий покупатель».**

**3. Место (территория) проведения рекламной игры – Республика Беларусь.**

**4. Срок проведения игры**

Игра проводится **с 01.05.2015 по 31.08.2015 года.**

**5. Призовой фонд Игры**

Призовой фонд Игры формируется за счет имущества Организатора, который составляет 18 663 600 (восемнадцать миллионов шестьсот шестьдесят три тысячи шестьсот) белорусских рублей и включает следующие Призы:

| № п/п | Наименование приза | Количество | Сумма, бел. руб. | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Поездка на двоих в Париж<br>Париж экспресс ВЕЙМАР-ПАРИЖ-ВЕРСАЛЬ*/ДИСНЕЙЛЕНД*-ЛЕЙПЦИГ с 26.10.2015 г. по 31.10.2015 г. (далее – Главный приз)<br>В стоимость входит:<br>- проезд по маршруту на комфортабельном автобусе;<br>- проживание в 2-х местных номерах со всеми удобствами в отелях 2*-3* (в сетевых отелях типа: Ibis, Kyriad, Campanile, Balladins и др.);<br>- 4 завтрака в отелях;<br>- экскурсии согласно программе;<br>- услуги русскоговорящего гида-группповода. | 1 | 10 666 000 | 10 666 000 |
| 2. | Планшет ASUS TF103CG-1A058A 8GB Black | 1 | 3 389 600 | 3 389 600 |
| 3. | Внешний аккумулятор (power bank) Pisen (Пайсен) Moonbox 6000 мАч (2 USB выхода, ток 2А) | 3 | 400 000 | 1 200 000 |
| 4. | Рюкзак Trend, с маркировкой | 7 | 204 000 | 1 428 000 |
| 5. | Полотенце банное MEDIUM, с маркировкой | 15 | 132 000 | 1 980 000 |

**6.** Для контроля за соблюдением Правил Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения Игры, рассмотрения спорных случаев, принятия решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникших при проведении Игры, **Организатор создает комиссию в составе 6-ти человек:**

Председатель комиссии:
Бойко Валерий Аркадьевич – директор ООО «НАЛАН»;
Члены Комиссии:
1) Рублева Наталья Яковлевна – заместитель директора ООО «НАЛАН»;
2) Каминская Ольга Геннадьевна – специалист по маркетингу ООО «НАЛАН»;
3) Строцкая Анна Александровна – юрисконсульт ООО «НАЛАН»;
4) Пархомчик Тимофей Валерьевич – начальник отдела розничных продаж ООО «НАЛАН»
5) Шершнева Дарья Витальевна – специалист по продажам ООО «АРОНДИ».
Члены комиссии не могут быть участниками рекламной игры.

**7. Цель Рекламной Игры**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации водонагревателей «Atlantic» серии Ego, O'pro и Steatite (далее – Игровой продукт) на территории Республики Беларусь.

**8. Участники**

Участником игры может стать любое физическое лицо, совершеннолетний (достигший возраста 18 лет), постоянно проживающий на территории Республики Беларусь, а также иностранный гражданин и лицо без гражданства, имеющее вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающий на территории Республики Беларусь, купивший любой водонагреватель торговой марки «Atlantic» серии Ego, O'pro и Steatite на территории Республики Беларусь, исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, и выразившее желание принять участие в рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**9. Для участие в игре необходимо в период с 01.05.2015 г. по 31.07.2015 г. включительно:**

• приобрести любой водонагреватель торговой марки «Atlantic» серии Ego, O'pro и Steatite на территории Республики Беларусь;

• получить купон у продавца или кассира магазина. При приобретении нескольких единиц Игрового продукта продавец или кассир выдает количество купонов, равное количеству приобретенного товара.

• Заполнить купон, указав разборчивым подчерком следующие данные:
- Фамилию, имя, отчество участника;
- Адрес постоянного проживания;
- Контактный телефон и адрес электронной почты (при наличии);
- Номер чека, дату покупки, сумму чека;
- Место покупки водонагревателя (название магазина, организации);
- Наименование водонагревателя;
- Личная подпись;

• Вложить заполненный купон в конверт и отправить по адресу: а/я -151 «Везучий покупатель» 220121, г. Минск. Дата отправления письма определяется по почтовому штемпелю отправления.

9.1. Кассовый и (или) товарный чек покупатель сохраняет у себя. Они в комплекте с гарантийным талоном будут являться подтверждением соблюдения условий Игры и основанием получения приза в случае выигрыша.

**10. К участию в Игре не принимаются:**

10.1. купоны, содержащие информацию о покупке водонагревателей торговой марки «Atlantic» серии Ego, O'pro и Steatite, совершенной не в сроки, указанные в п. 9 настоящих Правил, либо приобретенные не на территории Республики Беларусь;

10.2. письма, полученные позднее 07.08.2015 года (по почтовому штемпелю получения);

10.3. письма, присланные по почте не с территории Республики Беларусь. Пункты отправления определяются по почтовому штемпелю отправления на конверте;

10.4. письма, заполненные неразборчиво либо содержащие неполную информацию в соответствии с пунктом 9 настоящих Правил;

10.5. письма, содержащие неподлинные купоны (в случае сомнений в подлинности купонов проводится оценка их подлинности Комиссией);

10.6. письма, содержащие купоны с механическими повреждениями, не позволяющими определить соответствие купона установленной настоящими правилами форме и условиям.

11. Все письма, в том числе письма, указанные в подпунктах 10.1.-10.6. Участникам не возвращаются и хранятся у Организатора.

**12. Порядок участия в Игре, определения победителей Игры и выдачи Призов**

12.1. Каждый Участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз при условии покупки Игрового продукта и выполнения требований, необходимых для участия в Игре.

12.2. Каждому письму, участвующему в Игре, присваивается порядковый номер по дате получения.

12.3. Розыгрыш призового фонда проводится открыто. Победитель игры определяется случайным образом 10 августа 2015 г.

12.4. Розыгрыш призового фонда производится 10 августа 2015 г. в 12.00 в магазине «ТермоСтиль» по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, пом. 14Н.

12.5. Розыгрыш призового фонда проводится следующим образом – все карточки засыпаются в «лототрон» и перемешиваются, затем из «лототрона» один член комиссии достает одну карточку – так определяется победитель, выигравший приз. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, установленной пунктом 5 Настоящих правил.

12.6. Организатор информирует победителей о выигрыше по средствам телефонной связи и отправляет победителям по указанному Участником в письме адресу заказное письмо с уведомлением до 15.08.2015 г.

12.7. Торжественное вручение призов состоится 20 августа 2015 года в магазине «ТермоСтиль» в 17.00.

Для получения призов победитель должен явиться лично 20 августа 2015 года в магазин «Термостиль» по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39 предварительно связавшись с представителем Организатора по телефонам: 8-029-188-18-26, 8-033-300-10-56, городской (017) 224-21-77.

При себе победитель должен иметь паспорт и документы, подтверждающие покупку игрового продукта (чек и (или) товарный чек и правильно заполненный гарантийный талон с отметкой о дате продаже).

Информация, указанная в купоне, должна соответствовать фактически предоставленным документам о покупке.

Выдача Главного приза будет производиться путем вручения Сертификата на турпакет «Париж экспресс ВЕЙМАР-ПАРИЖ-ВЕРСАЛЬ*/ДИСНЕЙЛЕНД*-ЛЕЙПЦИГ с 26.10.2015 г. по 31.10.2015 г. и предоставления контактных данных туристического агентства «Энивей Трэвел». Далее победителю в срок до 30.09.2015 г. (включительно) необходимо обратиться в туристическое агентство «Энивей Трэвел».

После вручения сертификата на турпакет все вопросы и претензии по поводу организации тура необходимо направлять непосредственно в туристическое агентство «Энивей Трэвел».

12.8. В случае если победитель не может приехать за получением Приза, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта Победителя, своего паспорта и доверенности от Победителя, заверенной в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Доверенное лицо предоставляет Организатору документы, подтверждающие покупку игрового продукта (чек и (или) товарный чек) и правильно заполненный гарантийный талон с отметкой о дате продаже).

В случае если победитель либо его представитель не имеют возможности приехать за призом в день торжественного вручения, они могут приехать в другой день предварительно согласованный с организатором, но не позднее 31 августа 2015 г. в магазин «Термостиль» по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39. Выдача призов после 31.08.2015 г. не осуществляется.

12.9. Все расходы и налоговые обязательства (подоходный налог), связанные с получением призов, несут победители (физические лица) самостоятельно.

12.10. С момента передачи Призов Победителям к последним переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом.

12.11. Организатор не оплачивает участникам Игры расходы, связанные с проездом к месту получения Приза. В случае если победитель отказывается от Приза без объяснения причин либо не является за Призом в установленные сроки, Приз возвращается организатору.

12.12. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется.

**13. Публикация Правил**

**Правила рекламной игры** публикуются в газете «Звязда» до начала проведения рекламной игры. Результаты розыгрыша будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 19 августа 2015 г., а также на сайте организатора nalan.by.

**14. Прочие условия**

14.1. Факт участия в Игре подразумевает, что Участники ознакомлены и согласны с правилами Игры, а также соглашаются с тем, что в случае победы их имена, фамилии, отчества, фотографии, письма и интервью могут быть использованы Организатором Игры в любых рекламных и/или информационных материалах, а также соглашаются давать интервью либо сниматься для рекламных материалов, связанных с Игрой, без уплаты вознаграждения. Все права на подобные публикации и результаты съемок принадлежат Организатору.

14.2. Участники Игры, претендующие на получение Призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для получения Приза и Дополнительного приза документы, предоставляемые Организатором Игры.

14.3. Организатор не несет ответственность за качество и оперативность работы почтовых служб.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2540 от 28.04.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

■ Сітуацыя

# Крухмальныя «церні»

## Як новы прадукт прабівае сабе дарогу на рынкі

**Сёння можна купіць практычна любое абсталяванне, устанавіць яго і выпускаць тавар. Аднак, зразумела, у гэтым не будзе ніякага сэнсу, калі прадукцыя не запатрабавана на рынках. У гэтым цяпер на ўласным вопыце пераконваюцца ў прадпрыемстве «Рагозніцкі крухмальны завод».**
**Карэспандэнт «Звязды» азнаёміўся з матэрыяламі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, а потым завітаў на прадпрыемства, дзе цяпер заклапочаны загрузкай новай лініі па вытворчасці мадыфікаванага крухмалу.**

### ПРАГНОЗЫ...

Крухмальны завод у вёсцы Вялікая Рагозніца ў 1905 годзе пабудаваў мясцовы памешчык Мейштовіч. Спачатку выраблялі крухмал толькі ў сырым выглядзе, потым яго пачалі сушыць. А першую мадэрнізацыю прадпрыемства завяршылі разам з распадам Савецкага Саюза ў 1991 годзе. І ўжо ў суверэннай Беларусі адбылася сапраўдная «рэвалюцыя»: у 2011 годзе, так бы мовіць, па апошнім слове крухмальных тэхналогій, пабудавалі новы завод. Магутнасці па перапрацоўцы бульбы павялічыліся ўтрая, значна палепшылася якасць прадукцыі.

А год таму змантыравалі лінію па вытворчасці мадыфікаванага крухмалу. Для рэспублікі яна ўнікальная, бо крухмал для буравых работ у нас не вырабляўся — куплялі за валюту за мяжой. Да таго ж, абсталяванне разлічана на выпуск прадуктаў з рознымі фізіка-хімічнымі ўласцівасцямі, як патрэбна заказчыку.

Перада мной — некаторыя аналітычныя матэрыялы па гэтай тэме. Відавочна, што рашэнне аб закупцы лініі прымалася на высокім узроўні — у рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця бульбаводства, агароднінаводства і пладаводства на 2011-2015 гады. Па даручэнні ўрада вывучэннем попыту на новую прадукцыю і арганізацыяй вытворчасці займаліся канцэрн «Белдзяржхарчпрам», прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні». Быццам усё пралічылі. Атрымаўшы «дабро», завод правёў тэндар сярод пастаўшчыкоў абсталявання і за кошт банкаўскага крэдыту набыў у швейцарскай фірмы лінію па вытворчасці мадыфікаванага крухмалу. Аднак са збытам прадукцыі пакуль праблематычна. **Камітэт дзяржкантролю** канстатаваў, што летась лінія была загружана на... 5,9% ад запланаванай магутнасці. Прычым, далёка не ўсё з выраблення атрымалася прадаць.


Лінія па вытворчасці мадыфікаванага крухмалу чакае працы.

**ДАВЕДКА**
**Рэчыва пад назвай «мадыфікаваны крухмал» не мае ніякага дачынення да генетычна мадыфікаваных прадуктаў. Гэта звычайны, спецыяльна апрацаваны крухмал з дабаўкамі для пэўных мэтаў, які дзякуючы свайму саставу лепш засвойваецца. Яго прымяняюць, напрыклад, у вытворчасці прадуктаў харчавання, у цэлюлозна-папяровай прамысловасці, а таксама ў нафтахіміі для буравых раствораў.**

### ...І РЭАЛІІ

Накіроўваюся ў вёску Ляда Мастоўскага раёна, дзе пабудавалі новае прадпрыемства. **Дырэктар «Рагозніцкага крухмальнага завода» Валянцін БІЧ** паказвае лінію па вытворчасці мадыфікаванага крухмалу. Побач — упакаваная прадукцыя, абсталяванне зараз не працуе.

— Мы ў стане вырабляць канкурэнтаздольны па якасці і цане прадукт, які запатрабаваны на нашым рынку, але прабіцца туды пакуль не можам, — зазначае Валянцін Біч.

«Загвздка» ў тым, што прадукцыю трэба сертыфікаваць, а для гэтага яна павінна прайсці лабараторныя і вытворчыя выпрабаванні. Нафтаздабытчыкі быццам у ёй і зацікаўлены, але выдача заключэння зацягваецца, што не дазваляе заводу ўдзельнічаць у тэндары на рэалізацыю мадыфікаванага крухмалу.

Тым не менш Валянцін Біч верыць, што неўзабаве новы прадукт усё ж знойдзе дарогу да сваіх спажыўцоў. Нядаўна з вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» атрымалі папярэдні акт па выніках выпрабаванняў, дзе няма прэтэнзій да якасці прадукцыі.

— Чакаем афіцыйны дакумент і збіраемся ўдзельнічаць ў тэндары па закупцы гэтага прадукту на наступнае паўгоддзе, — кажа кіраўнік прадпрыемства.

— Аднак ці зможаце канкураваць з замежнымі вытворцамі не толькі па якасці, але і цане?

— Безумоўна. Дарэчы, мы сёння таксама можам мадыфікаваць кукурузны крухмал, які значна таннейшы за бульбяны.

Акрамя нафтаздабычы, цяпер прапрацоўваюцца і іншыя рынкі збыту. Напрыклад, ужо заключылі кантракт з буйным прыватным прадпрыемствам, якое вырабляе заменнікі цэльнага малака для выпойвання цялят. Неўзабаве завяршацца ўсе ўзгадненні і вялікаму аб'ёму прадукцыі будзе гарантаваны збыт. Супрацоўнічаюць з прадпрыемствам «Светлагорск Хімвалакно», разглядаюцца і іншыя варыянты.

Дарэчы, сфера выкарыстання мадыфікаванага крухмалу даволі шырокая і мастацтва маюць намер максімальна павялічыць свой асартымент. Але гэта — заўтра. А сёння трэба наладзіць пастаўкі буйным спажыўцам, каб аптымальна загрузіць новую лінію і своечасова разлічыцца з крэдытарам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота аўтара.**

*Мастоўскі раён*

■ Стыхія

# Наступствы вымяраюцца дзясяткамі мільёнаў

## У школах, на фермах, жылых дамах давялося мяняць дах

**Ураган, які пранёсся 13 красавіка над паўднёвымі раёнамі краіны, нарабіў бяды ў многіх вёсках Лунінецкага раёна. У філіяле «Лобчанскае» Лунінецкага малочнага завода разбурыла цялятнік і пазносіла стрэхі з фермаў. Але зараз практычна ўсе аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння адрамантаваны.**



Значную шкоду стыхія нанесла жыллю прыватнага сектара ў вёсках Кажан-Гарадок, Любань, пасёлку Палескі. Гаворка ідзе таксама пра дахі над жылымі дамамі. Разрывала не толькі шыфер, паразбурала нават драўляныя канструкцыі новабудоўляў. Сёння шэраг вяскоўцаў атрымалі выплаты па страхоўках, большасць ужо адрамантавала жыллё. Работу працягваюць весці тыя, хто вырашыў зрабіць больш трывалыя канструкцыі, напрыклад замест шыфернай страхі пакласці металачарапіцу.

У Драгічынскім раёне за лічаныя хвіліны «раскрытай» аказалася Немяржанская сярэдняя школа. На наступны дзень у школу прыехалі прадстаўнікі аддзела адукацыі райвыканкама, быў складзены план работы. Рамонт пачалі адразу. Заняткі ў школе не перарываліся ні на дзень, вучэбны працэс не пацярпеў. Добра і тое, што ў гэты перыяд амаль не было дажджоў. Таму будаўнічая брыгады справілася з работай не многім больш, чым за тыдзень. Зараз аснoўная праца скончана.

— Рыхтуем пакет дакументаў на абласную камісію па надзвычайных сітуацыях, спадзяёмся на фінансавую дапамогу, — сказаў **намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Сяргей КУНІЦКІ**. — Паралельна вядзём работы па рамонце. Стыхія прынесла сур'ёзныя разбурэнні сельгаспрадпрыемствам раёна, наступствы вымяраюцца дзясяткамі мільёнаў рублёў. Так, напрыклад, у СВК «Навадворскае-Агра» знішчана больш за 1,5 тысячы лістоў шыферу. Моцна пацярпелі фермы, цялятнікі, паветкі ў Плешычах, Лышчы, Парахонскім. І калі ў Парахонскім фактычна ўсе пабудовы былі застрахаваны (ім будзе намнога прасцей атрымаць кампенсацыю), то іншыя аграрыі свае спадзяванні звязваюць з дапамогай вобласці.

Што датычыць аб'ектаў адукацыі, культуры, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія пацярпелі ў Пінскім раёне, то там разбурэнні былі нязначнымі. У асноўным гаворка ішла пра некалькі сарваных лістоў шыферу, якія замянілі на новыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Дайце рады!

# РУКІ-НОГІ ЁСЦЬ. А СУМЛЕННЕ?

## Нават пад пагрозай страты жылля некаторыя магіляўчане не жадаюць працаўладкоўвацца

**У нос шыбае рэзкае амбрэ і рука міжвольна цягнецца заціснуць нос. У зале судовых пасяджэнняў двое братоў і сын аднаго з іх. Лад жыцця наклаў на іх твары адбітак. Нават на самага маладога, якому ўсяго крыху больш за 20 гадоў. З канца 2012 года яны не плацяць за кватэру і вялікага жадання вяртаць дзяржаве амаль што 15-мільённы доўг не праяўляюць.**

Перыядычна ў іх «трохпакаёўцы» адключаюць ваду і электрычнасць, але ім гэта ўсё да лямпачкі. На прадпісанні, якія выносяць камунальнікі, не рэагуюць. Навет судовае пасяджэнне для іх не першае. Мужчынам далі месяц на роздум, але яны і ў вус не дзьмуць, нават капейкі не ўнеслі, каб неяк прасігналізаваць: маўляў, зразумелі — выправімся.

Суддзя зачытвае іскавую заяву. Па сутнасці, гэта чарговы напамін аб пагрозе скасавання дагавора найму жылля паміж імі і дзяржавай. Нельга карыстацца чужой маёмасцю і не плаціць за гэта грошы.

— Іск прызнаеце? — пытаецца суддзя.

— Не, — катэгарычна адказвае адзін.

— Мне ўсё роўна, — пацiскае плячыма другі.

— Так, — згаджаецца трэці.

Камунальнікі страцілі ўжо надзею, што нешта зменіцца і падшукалі ніядбайным жыхарам новыя «апартаменты». Умовы, відома, не тыя, што ў камфартабельнай трохпакаёўцы. Агульная плошча ўсяго 18 квадратных метраў, пакоя — наогул 13,6. Акрамя санвузла, у новым жыллі ніякіх іншых выгод. Але кватэра цалкам адпавядае спажывецкім якасцям: у ёй зроблены рамонт, ёсць гарачая і халодная вада.

— Затое па трохпакаёўцы, дзе яны цяпер жывуць, капрамонт плача, — сведчыць прадстаўнік ЖКГ. — Кватэра знаходзіцца ў антысанітарным стане, сантэхнічнае абсталяванне патрабуе замены. А жыхарам да гэтага ніякай справы.

**«Не плаціў і не збіраюся». — «А калі суд вас перасяліць?» — цярпліва дапытваецца суддзя. «І там плаціць не буду», — нават не абнадзейвае ён і з нейкім выклікам кідае: «Хачу быць бамжом».**

Браты прапісаны ў кватэры з 1969 года, цяпер ніводны з іх не працуе. Адзін жыве за кошт дзяржавы з 2011 года, але запэўнівае, што хутка знойдзе ў Расіі працу і аддасць доўг. Тое ж ён казаў і на першым пасяджэнні, але пакуль яго мары не супадаюць з рэчаіснасцю. За гэты час можна было б стаць на ўлік па беспрацоўі, але ён нават не скарыстаўся такой магчымасцю. Яго брат наогул катэгарычна заявіў: «Не працаваў і працаваць не буду». Некалькі разоў ён сядзеў у турме, адзін час знаходзіўся на ўліку ў наркадыспансеры. «А калі апошні раз працавалі?» — пытаецца суддзя. «Не памятаю», — здаецца, што мужчыну абыякава ўсё, што адбываецца вакол яго. «А працоўная кніжка ёсць?» — спрабуе хоць неяк разварушыць яго суддзя. «Няма», — адразае ён. Яму нагадваюць пра запазычанасць, але ён нахабна заяўляе: «Не плаціў і не збіраюся». — «А калі суд вас перасяліць?» — цярпліва дапытваецца суддзя. «І там плаціць не буду», — нават не абнадзейвае ён і з нейкім выклікам кідае: «Хачу быць бамжом».

Гарантаваны даход, пенсія па інваліднасці, ёсць толькі ў малодшага з жыхароў, сына кандыдата «ў бамжы». Але і ён не плаціць. Некалькі разоў былі спробы нешта ўтрымаць з яго невялічкага даходу, але гэта не вельмі паўплывала на мільённы даўгі. Чаму не плаціў, незразумела, хаця за новае жыллё абяцае разлічвацца своечасова. Але, прызнаецца, не хацеў бы дзяліць яго з бацькам і дзядзькам.

Усе трое маюць жаласны выгляд, але якое там можа быць спачуванне. Яны ж рукі-ногі маюць, і розуму знайсці грошы на гарэлку хапае. Проста іх задавальняе становішча дармаедаў. Працаваць на дзяржаву яны не спяшаюцца, як і выязджаць з кватэры, якую яна ім прадаставіла. Рашэнне суда аб перасяленні іх не задаволіла, хутка будзе разглядацца касацыйная скарга. Тое, што гэта таксама каштуе грошай, іх не турбуе. Разумеюць толькі свае правы і нічога не жадаюць чуць пра абавязкі.

— Па законе наймальнікі жыллёвага памяшкання дзяржаўнай маёмасці і члены іх сям'яў, якія без уважлівай прычыны паўгода не плацяць за камунальныя паслугі і карыстанне жылым памяшканнем, высяляюцца ў судовым парадку ў іншае памяшканне, якое меншае па плошчы і (або) саступае папярэдняму па сваіх спажывецкіх якасцях, — тлумачыць **памочнік пракурора горада Магілёва Веранiка ІВАШКЕВІЧ**, спасылаючыся на артыкул 86 Жыллёвага кодэкса. — Пры гэтым ёсць рызыка змяніць гарадскую прапіску на вясковую, а, калі гэта інтэрнат, наогул застацца без жылля. Летась такія перасяленні адбыліся па 16 ісках, якія разглядаліся ў судзе. Казаць пра нейкую там жорсткасць ці несправядлівасць нельга.

**У ТЭМУ**

— На жаль, людзі не заўсёды разумеюць, наколькі вялікая ў іх рызыка страціць кватэру праз запазычанасць па камунальных, — кажа **загадчыца сектара па працы з запазычанасцю насельніцтва Магілёўскага цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм Кацярына САРОКА**. — Летась па рашэнні суда адбылося 27 перасяленняў. Для параўнання — пазалетась іх было толькі 2. Алгарытм такі: мы рыхтуем дакументы, перадаём іх у ЖРЭУ, адтуль яны накіроўваюцца ў суд. Новы Жыллёвы кодэкс дазваляе таксама працаваць і з уласнікамі кватэр. У мінулым годзе на прымус да адчужэння іх маёмасці праз суд намі было падрыхтавана 16 пакетаў. Але да суда не дайшоў ніводны, паколькі людзі своечасова спахапіліся. Сёлета адна такая справа разглядалася ў судзе, але ўласніца зразумела, наколькі ўсё сур'ёзна, і цалкам пагасіла доўг.

Кожны ведаў аб наступствах, але нічога не рабіў, каб выправіць становішча. Большасць кватэрных неплацельшчыкаў менавіта дармаеды і ўтрыманцы. Чалавек павінен несці сацыяльную адказнасць перад грамадствам. Калі яму няма справы да гэтага грамадства, чаму іх нехта павінен шкадаваць. Тым больш што хапае добрасумленных грамадзян, якія прыносяць карысць дзяржаве, але жывуць у горшых умовах. І пра іх трэба думаць у першую чаргу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**



# З «ВЕСЯЛУХАЙ» — У МІНУЛАЕ І Ў БУДУЧЫНЮ

**Месца, дзе чалавек нараджаецца, не проста кропка на карце. Таму што кожны з нас вырастае, арыентуючыся на шматгадовы вопыт мінулых пакаленняў. Чым большы багаж гістарычнай і культурнай спадчыны — тым багацейшы народ і кожны жыхар той ці іншай мясцовасці. Пазнаёміўшыся з народным ансамблем народнай песні «Весялуха» з вёскі Скірмантава, што ў Дзяржынскім раёне, чарговы раз можна пераканацца ў дакладнасці гэтай думкі.**

Паездка са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» у Скірмантава стала чарговым адкрыццём і ў пэўным сэнсе святам сярод будняў. Таму што, слухаючы тутэйшыя песні, размаўляючы з удзельнікамі ансамбля, паглыбляючыся ў гісторыі, традыцыі вёскі, атрымліваеш багатую гаму ўражанняў. Пачаць варта з гісторыі самой «Весялухі».

— Наш ансамбль існуе ўжо не адзін дзясятак гадоў. Цяпер тут застаўся, можна сказаць, касцяк ад першага складу калектыву, які ён быў у 1982 годзе. Мы пачыналі з маім нябожчыкам мужам. Ён быў добрым баяністам. У 1993-м атрымалі званне «народны», якое ўжо сем разоў пацвярджалі. І па сённяшні дзень выступаем усе разам. Радуем песнямі нашых аднавяскоўцаў, — расказвае **кіраўнік Наталля РАДЗЬКО**. — Бываем у Мінску на розных кірмашах, на раённых святах выступаем. І танцы ставілі, і займаліся пастаноўкай абрадаў. Традыцый у нас тут шмат, мы іх свята зберагаем і працягваем.

Сёння ў «Весялухі» новы баяніст — Сяргей Чупін. І ў суправаджэнні баяна мы слухаем песні скірмантаўскай зямлі...

*Цячэ рэчка каламутна, чаму дзеўка така смутна?*
*Я і смутна, і сярдзіта, бо я з ночы была біта*
*(кожны другі радок паўтараецца).*
*Біла мяне маці з ночы за Івана кары вочы,*
*Шчэ й, казала, будзе біці, каб Івана не любіці.*
*Мая мамка, даражэнька, як была ты маладзенька,*
*Ты ж любіла майго татку, як люблю свайго Іванку.*
*Я Іванку так любую, дзе ні стрэчу, там цалую.*
*Ты, Іванка, сэрца мае, няма крашэ, як нас двое.*

Жанчыны, якія сёння спяваюць у ансамблі, адзначаюць, што песня заўсёды была спадарожнікам іх матуль і бабуль — як дома, так і на любым свяце. Цікавы і вясёлы быў час, калі суседзі збіраліся ў адной кампаніі і спявалі пад гармонік. А дзеці ўслухваліся ў мелодыі і глядзелі на дарослых, якія часам нават плакалі — бо, як зараз ужо зразумела, там спявала душа.

*Паляцеў галуб у поле жывіцца,*
*Паехаў Ясю з дому жаніцца.*
*Прыляцеў галуб нажывіўшыся,*
*Прыехаў Ясю ажаніўшыся.*
*Стрэла матачка паўдарожачкі*
*Сваяго сынка салодкім вінцом,*
*А нявестачку ды з атрутачкай.*
*Сын віна не піў, пад каня выліў,*
*А атрутачку пажадна выпіў...*
*Пахавала сына перад цэркаўкай,*
*А нявестачку па-за цэркаўкай...*

Такія вось гісторыі часам адлюстраваны ў тых песнях. І хоць становіцца сумна, але ж верыцца ў лепшае. Захоўваюць у гэтай мясцовасці не толькі песенны матэрыял, але зберагаюць і шануюць традыцыі, абрады. Напрыклад, перад Піліпаўскім постам у Скірмантаве праходзіць вечарынка з абрадам «Ката пячы». Збіраюцца хлопцы, дзяўчаты і замужнія пары ў адной хаце. Спачатку пякуць «ката», якога потым пад музыку выносяць да гасцей. Рэцэпт простый: выпякаюцца з цеста (з дабаўленнем драждж і яек) тулава ката, яго галава і лапкі, а потым кот збіраецца поўнасцю — усе часткі замацоўваюцца з дапамогай зубачыстак, хвост робяць з каўбасы, вушкі — з кавалачкаў сала. Гатовага катка падвешваюць да столі і тады пачынаюць весяліцца. Ад фігуркі кожнаму трэба адкусіць кавалачак, а калі не ўдаецца, то давядзецца плаціць фант (выканаць нейкае жартоўнае заданне, патанцаваць). У выпадку, калі не ўдалося адкусіць ад ката маладой пары, ім трэба «галубоў пакарміць» — пацалавацца.

*...Як за гаем, гаем дзевер воду носіць*
*Ой, там маці, маці свайго сына*
*Вячэраці просіць.*
*Ну вячэрай, маці, калі наварыла,*
*А я сяду, сяду ды паеду,*
*Дзе дзяўчына міла.*
*Ой, як еду, еду, у дарожцы прыстану.*
*Ой, там маю, маю дзеўчыноньку*
*Хлопцы абдымаюць.*
*Абдымайце, хлопцы, адно не цалуйце*
*Толькі маёй, маёй дзяўчыноньцы*
*Лічанька не псуйце...*

Мясцовыя жыхары не толькі захоўваюць памяць аб мінулым у песнях, а і ўмеюць ствараць прыгожыя рэчы сваімі рукамі. У Скірмантаве ёсць жанчына, якая вырабляе лялек. Людміла Ламака стварае абрадавыя, гульнявыя лялькі і лялькі-абярэгі. Пра іх яна можа расказваць доўга. Кожная лялька мае сваю гісторыю і прызначэнне.

— Вось гэтая лялька — на ўдалае замужжа. Яе пажадана зрабіць самастойна альбо можна купіць і ўпрыгожыць нейкай сваёй стужкай, а дарыць такую ляльку нельга. Як вядома, муж — галава, а жонка — шыя. Куды яна паверне, туды галава і будзе глядзець. Таму акцэнт зроблены на гэтай частцы, — тлумачыць Людміла. — У яе на шыі некалькі каўнерыкаў (іх павінна быць няцотная колькасць) і на кожны трэба загадаць жаданне, звязанае з будучай сям'ёй.



Цікавасць да старонак мінулага свайго краю, да гісторыі свайго народа ўласціва кожнаму чалавеку. Паходжанне назвы вёскі Скірмантава, магчыма, звязана з наступным эпізодам. «Хроніка Быхаўца», знойдзеная ў 1830 годзе, паведамляе: «Князь Скірмунт княжыў у Навагрудку... Быў у той час цар заволжскі на імя Балаклай. І прыслаў ён пасаў сваіх да вялікага князя Скірмунта, каб яму даніну даваў і баскакаў ягоных трымаў па тых гарадах, як з тых гарадоў даніна ішла і пры яго папярэдніках, князях рускіх. Але князь вялікі Скірмунт паддацца таму не хацеў і загадаў насы ды губы пасламі Балаклаевым паадразаць, і потым да Балаклая іх адпусціў. А той цар на лета, сабраўшыся з многімі сіламі і ордамі татарскімі, пайшоў на Рускую зямлю і многа зла там учыніў. І князь вялікі Скірмунт, сабраўшы ўсе свае войскі, спаткаў яго на мяжы сваёй, у Койданаве, і разбіў таго цара, і ўсю яго моц татарскую пабіў, і самога цара забіў, і з перамогаю вялікай пайшоў на Рускую зямлю...» Напэўна, у гонар князя Скірмунта і названа паселішча.

У XVII — пачатку XIX ст. Скірмантава (тады яшчэ фальварак) належала Радзівілам. А з сакавіка 1854 года маёнтак быў куплены памешчыцай Язьвінскай — дваранкай-каталічкай...

Да Вялікай Айчыннай вайны вёска была вельмі прыгожай. А падчас вайны, у 1942 годзе, быў створаны атрад імя Будзённага. Партызаны дыслацыраваліся ў лясах вакол Скірмантава вялі актыўную дыверсійную дзейнасць па разбурэнні рэек, мастоў, дарог. У адказ фашысты правялі шэраг карных аперацый, адной з якіх была аперацыя «Герман». У яе выніку вёска Скірмантава 29 ліпеня 1943 года была спалена разам з жыхарамі...

Пасля вайны паселішча пачало адраджацца. Сёння ў вёсцы ёсць краязнаўчы музей. Ён знаходзіцца ў памяшканні мясцовага Дома культуры. Прадметы сялянскага побыту (калаўроты, кросны, цапы і г.д.), грашовыя купюры мінулых часоў з розных краін свету, каскі і макет партызанскай зямлянкі — гэтыя экспанаты запрашаюць у падарожжа па гісторыі тутэйшых мясцін. Вандруйце, спявайце і не губляйце сувязі з мінулым!

**Алена ДРАПКО.**

## Святочная праграма на пятніцу, 1 мая (са змяненнямі і ўдакладненнямі).

## ПЯТНІЦА, 1 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20, 9.10 Меладрама «Будзе светлым дзень». 1-я і 2-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**10.50 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3».**
**12.45** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**13.15, 15.45 Камедыя «Клубнічны рай». 1-я і 2-я серыі.**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**17.30 Камедыя «Яблычны спас». 1-я і 2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40** Нашы.
**21.55 Фільм-катастрофа «Метро».**
**0.15 Меладрама «Майскі дождж».**
**1.50** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.30** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.05 Камедыя «Пакроўскія вароты». 1 я і 2-я серыі.**
**12.40** Капейка ў капейку.
**13.15, 22.35 Драма «Аўстралія».**
**16.05** Вось гэта дзіва!
**16.40 Камедыя «Оптам танней».**
**18.30 Камедыя «Оптам танней-2».**
**20.20** «Хачу ў тэлевізар». Заключны выпуск.
**21.00** Цела чалавека.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.40** Рэпарцёр.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 16.15, 18.35, 0.05** Калейдаскоп.
**8.10 «Небяспечныя гастролі». Драма.**
**9.35, 18.05, 21.05** Прэм'ера. «Грані Перамогі». Дак. серыял.
**10.00 «Сібірыяда». Эпічны кінараман. Частка 3-я і 4-я.**
**11.40 «Кур'ер». Камедыя.**
**13.05** «Прыгоды Бураціна». М/ф.
**14.10** «Размаўляем па-беларуску».
**14.15** Канцэрт, прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі.
**16.25 «Волга-Волга». Камедыя.**
**18.45** «Нябачны фронт». Георгій Жукаў.
**19.30 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. Кінаэпапея «Вызваленне». Фільм пяты «Апошні штурм».**
**20.45** Калыханка.
**21.35 «Раманс пра закаханых». Драма. 1-я і 2-я серыі.**
**23.40** «Камертон». Ягор Канчалоўскі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 2.20** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Муай-тай. К-1. Файт-шоу «Тонгкат».
**8.30** Авертайм.
**9.00** Гандбол. Адборачны матч ЧЕ-2016. Беларусь — Данія. Мужчыны.
**10.25** Тэніс. Турнір ВТА. Чарльстан. Фінал.
**12.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**13.25** Піт-стоп.
**13.55** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Нарвегія.
**23.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія — Швецыя.
**1.25** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Ералаш».
**9.35 Маст. фільм «Цырк».**
**11.15 Камедыя «Трэмбіта».**
**13.00 Камедыя «Каралева бензакалонкі».**
**14.25 Камедыя «Паласаты рэйс».**
**16.15, 20.55** Навіны спорту.
**16.20** «Адваротны адлік».
**16.55 Камедыя «Салдат Іван Броўкін».**
**18.40** Іосіф Кабзон, Тамара Гвердцытэлі, Леў Лешчанка ў юбілейным канцэрце аркестра «Фанограф».
**21.00** «Сёння вечарам».
**22.40** «Грыгорый Лепс і яго сябры».
**0.45 Маст. фільм «Гарачыя галовы-2».**

### СТБ

**6.15, 9.30, 13.45, 23.30** «Легенды СССР».
**7.50 Маст. фільм «Аналізуй тое».**
**10.25, 1.10 Маст. фільм «Уладар кольцаў. Брацтва кольца».**
**13.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.25 Маст. фільм «Уладар кольцаў. Дзве крэпасці».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05 Маст. фільм «Уладар кольцаў. Вяртанне караля».**
**23.30** «Легенды Рэтра ФМ».
**0.25** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.

### МІР

**6.00, 15.00** М/ф.
**7.55 Маст. фільм «Кубанскія казакі».**
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Казка пра страчаны час».**
**11.55 Маст. фільм «Каралеўства крывых люстэркаў».**
**13.25 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы».**
**16.15 Серыял «Вялікі перапынак».**
**21.25** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**0.15 Маст. фільм «Блеф».**
**2.15 Серыял «Варажбітка».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Вялікая сям'я».**
**9.25 Камедыя «Бедная Liz».**
**11.15** Шоу-спектакль, прысвечаны 80-годдзю мастацкай гімнастыкі.
**12.40, 14.20 Маст. фільм «Кожны за сябе».**
**14.00, 20.00** Весткі.
**18.05** «Disco дача». Вясновы канцэрт.
**20.35** «Ізмайлаўскі парк».
**22.20 Маст. фільм «Замест яе».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.40 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**
**7.15, 08.20, 10.20 Серыял «Дуброўскі».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**11.45, 13.25 Дэтэктыў «Рэквіем для сведкі».**
**15.50** «Справа густу».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.25 Серыял «Ляснік».**
**23.00** Усенародная прэмія «Шансон года-2015».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.00, 19.45, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.30, 18.40 Серыял «Цнатлівая».**
**9.25, 13.45, 15.45, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30** «Кінаблакнот».
**10.40 «Драма «Падмена».**
**13.00** Дак. фільм «Праведная Матрона Маскоўская».
**14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Кландайк».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Рабства».**
**23.30** «Хобі TV».

## АЎТОРАК, 5 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10, 22.10 Серыял «След».**
**10.50 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Першы ўдар».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 15.25 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**16.15** Беларуская часінка.
**17.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Данія — Беларусь.
**19.35, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**19.55 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Заходні фронт».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.55** Дзень спорту.
**1.05 Да 70-годдзя Перамогі. Кінаэпапея «Вызваленне». Фільм 1-ы «Вогненная дуга».**



### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.25** Тэлебарометр.
**9.05, 23.50 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Знішчальнікі».**
**10.55 Да 70-годдзя Перамогі. «Партызаны».**
**11.25 Да 70-годдзя Перамогі. Кінааповесць «Я цябе ніколі не забуду».**
**13.05** «Fitnews».
**13.35** Кіпень.
**13.55 Серыял «Косці».**
**15.40, 18.55 Серыял «Інтэрны».**
**17.55 Серыял «Віртуозы».**
**21.00** Цела чалавека.
**21.30** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Першы матч. «Ювентус» — «Рэал».

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30, 12.30, 18.55, 23.25** Калейдаскоп.
**7.40, 18.00 «Жазэф Бальзамо». Драма.**
**8.35, 19.05, 21.05** «Грані Перамогі». Дак. серыял.
**9.05 «Аленяе паляванне». Драма.**
**10.15 «Кубанскія казакі». Камедыя.**
**12.00, 23.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Аляксандра Дзянісава.
**12.40 «Прыміце тэлеграму ў доўг». Камедыя.**
**13.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.30 «Ляцяць жураўлі». Кінааповесць.**
**16.00** «Душэўныя боепрыпасы». Дак. фільм.
**16.30** «Рокуэл Кент». Дак. фільм. Фільм другі.
**19.30 «Дзеля некалькіх радкоў...». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.30 «На шляху ў Берлін». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.05, 10.30** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**7.30, 2.45** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «ФК Гомель» — «Шахцёр» (Салігорск).
**9.45** Час футбола.
**12.00, 19.30** Тэніс. Турнір ВТА. Мадрыд.
**16.45** Авертайм. ЧС-2015.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Германія.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Славенія.
**23.35** Спорт-кадр.
**23.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Аўстрыя — Францыя.
**1.55** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Вайна і міфы».
**15.00** «Эшалоны на Берлін».
**16.20** «Адваротны адлік». «Спіс Гімлера».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Вайна машын». Т-34. Франтавая легенда».
**21.40 Серыял «У вас будзе дзіця...».**
**23.40** «Вялікая вайна».
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.15 Серыял «Замах».**
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Наша справа».
**14.00** «Верны сродак».
**14.50, 23.20 Серыял «Водбліскі».**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.30** «Наша Перамога». Тэлемарафон.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**1.00** «Дакументальны праект»: «Тытанік. Рэпартаж з таго свету».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** Дак. фільм «Пісьмы з фронту».
**9.30 Серыял «Немец».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20** Дак. серыял «Каханне і вайна».
**14.10, 4.20 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Служу Савецкаму Саюзу!».**



**21.20, 23.15 Серыял «Выратуйце нашы душы».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**1.30 Маст. фільм «Авіятар».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Серыял «Жыццё і лёс».**
**13.00** «Ад герояў былых часоў. Песні Вялікай Перамогі».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10, 20.55 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».**
**21.20, 23.10 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Вызваліцелі».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** «Усё будзе добра!».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Ляснік».**
**23.10 Серыял «Чужыя крылы».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.20** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.20, 18.35 Серыял «Цнатлівая».**
**9.05** «Кінаблакнот».
**9.25, 13.55, 15.45, 16.55, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30, 23.25** «Хобі TV».
**11.00 Драма «Гітлер. Узыходжанне д'ябла», 1-я серыя.**
**12.30 Драма «Двойчы народжаны».**
**14.15 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.05 Драма «Пяць вечароў».**



**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Драма «Уладар буры».**

### ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 19.00** Серыял «Кахае — не кахае».
**10.00, 20.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00, 18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**12.00** Драма «Перамотка».
**14.00, 23.00, 2.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** «Лэдзі на мільён».
**16.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**21.10** Камедыя «Уладар ежы».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны культуры.
**10.15, 0.45** «Наглядальнік».
**11.15** «Заўтра была вайна». Маст. фільм.
**12.45, 15.35** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.05, 20.10** «Правілы жыцця».
**13.35** «Эрмітаж — 250».
**14.05, 1.40** «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.
**15.10** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Хлопчыкі дзяржавы». «Барыс Чычыбабін».
**15.55** «Ці была Клеапатра забойцай?». Дак. фільм.
**16.55** Васіль Герэла, Фабіа Мастранджэла і аркестр «Руская філармонія» ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**18.15** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Жалезны паток. Бітва заводаў». Дак. фільм.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Штучны адбор.
**20.40** «Апошнія дні Ганны Балейн». Дак. фільм.
**21.40** «Гульня ў бісер». «Паэты, паўшыя на Вялікай Айчыннай вайне. Павел Коган, Міхаіл Маёраў, Міхаіл Кульчыцкі».
**22.25** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Бітва за Эльбрус».
**23.05** «Напісана вайной». Леанід Кураўлёў чытае верш Аляксандра Межырава «Прачынаюся і куру...».
**23.30** Успамінаючы рэжысёра. «Чароўная Жызэль». Дак. фільм. Частка 1-я.
**2.35** Іграе Валерый Афанасьеў.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Мікалай Наскоў і група «Мікалай». 1996 год.
**6.45, 7.55, 8.35, 9.05, 11.20, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 17.35, 19.10, 20.50, 21.40, 23.00, 23.25, 0.40, 1.55, 2.40, 3.55, 5.35** Музычная Настальгія.
**7.00** «Спяем, сябры» з Тацццянай Візбар. Алена Фралова. 2007 год.
**8.30** М/ф «Як казакі соль куплялі».
**9.00, 17.30, 23.20** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**10.00** Маст. фільм «Мора нашай надзеі».



**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
**13.10** Маст. фільм «Наш сумленны хлеб».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00, 1.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». В. Цой «Дзесяць хвілін». 2008 год. 2-я частка.
**19.30** Маст. фільм «Уключыце паўночнае зззянне».
**23.40** М/ф «Вяснянка».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1960-ы. 2-я частка. Паўтор ад 16.05.2009 года.
**2.30** М/с «Болек і Лёлек».
**3.00** «Быў час». 2010 год.
**4.30** Маст. фільм «Нянавісць».

### EUROSPORT

**9.30** Футбол. Еўрагалы.
**10.15, 17.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**13.00, 23.15, 2.15** WATTS.
**14.00** Лёгкая атлетыка. Багамскія астравы.
**16.00, 1.15** Веласпорт.
**21.00** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**21.15** Бокс. J. Braehmer (Германія) — R. Krasniqi (Германія).
**23.30** Аўтагонкі. Чэмпіянат свету па эндуранс. Агляд.
**0.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**0.30** Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ. Прэв'ю сезона.
**0.45** Аўтагонкі. Хакенхайм.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.55, 22.00, 3.10** Серыял «Пакетная здзелка».
**6.45** Камедыя «Калядная пяцёрка».
**8.25** Камедыя «Дарагая, мы паменшылі сябе».
**9.40, 14.25, 15.15, 21.45, 22.50, 0.55, 2.50, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**10.45** Камедыя «Вострaў скарбаў».
**12.35** Камедыя «Спатканне».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**18.40** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**20.20** Камедыя «Прыдуркі».
**22.25** Серыял «Былыя». 1-я серыя.
**23.10** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**1.15** Камедыя «Шалёныя грошы».
**4.00** Камедыя «Мамусі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.20** «Доктар І.».
**7.50, 18.50, 1.50** Серыял «Эзель».
**9.40, 3.55** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.25, 17.50** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.20, 16.55** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.15, 20.50** Серыял «Браты па абмене».
**14.10, 3.30** «Простыя складанасці».
**14.40, 1.05** Серыял «Управа».
**15.30, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.25, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.50, 0.20** Серыял «Шапавалаў».
**23.35** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**7.10, 4.05** Драма «Шляхі і путы».
**8.50** Трагікамедыя «Гуманітарныя навукі».
**10.30** Трылер «Стэлс».
**12.30** Камедыя «Ну што, прыехалі?».
**14.10** Драма «Басанож па смажжах».
**16.00** Фантастыка «Дывергент».
**18.15** Камедыя «Развод паамерыканску».
**20.00** Драма «12 гадоў рабства».
**22.15** Драма «Дыяна: Гісторыя кахання».
**0.10** Драма «Лінкальн для адваката».
**2.10** Трылер «Пакой страху».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Джунглі».
**7.55** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**10.40** Прыгоды «Прыватнае піянерская».
**12.40** Прыгоды «Два капітаны».
**14.20** Меладрама «Унук Гагарына».
**15.50** Меладрама «Федзька».
**18.00** Драма «Дуброўскі».
**20.20** Драма «Анёлы вайны».



**22.00** Баявік «Спіраль».
**23.50** Драма «Выгнанне».
**2.30** Меладрама «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
**4.20** Драма «Агні прытона».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 22.30, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55, 10.55** Аўта-SOS.
**9.25, 14.00, 19.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**10.10, 14.45, 20.15** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**11.40, 5.15** Шаша праз пекла.
**12.30** Цяжкае золата Аляскі.
**15.35** Дзікая прырода Амазонкі.
**16.20** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.10, 3.00** Верталётныя баталіі.
**17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Кіраванне натоўпам.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Узлом Сістэмы.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Хуткія і гучныя.
**9.40, 13.50** Геній аўтадызайну.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.00, 6.24** Скаваныя.
**14.40, 5.36** Скрыўленне часу.
**16.20, 4.00** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**17.10, 23.00, 4.48** Махінатары.
**18.50** Аляска: сям'я з лесу.
**19.40** Зорнае выжыванне.
**20.30** Вострaў.
**22.10** Гаражная каманда.
**23.50** Вулічныя гонкі.
**0.40, 3.10** Бітвы за кантэйнеры.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

---

## Ваенкіно

# З ЧАГО ПАЧЫНАЎСЯ ІТАЛЬЯНСКІ НЕАРЭАЛІЗМ

**На гэтым тыдні можна будзе пабачыць бясспрэчны шэдэўр сусветнага кінематографа — італьянскі фільм «Рым, адкрыты горад» Рабэрта Раселіні.**

Створаная выдатным рэжысёрам карціна, можна сказаць, стала пачаткам хвалі італьянскага неарэалізму, за якой і Віторыа дэ Сіка, і Лукіна Вісконці, і Джузэпэ дэ Санціс. А гэта плеяда шчырых, адкрытых, таленавітых аўтараў, якія стварылі фільмы-люстэркі. Стужкі, дзе паказвалася сапраўднае жыццё простых, знясіленых людзей, іх побыт і стан, настрой і размовы так, быццам фільм — не іграваня стужка, а дакумент часу.

Карціна «Рым, адкрыты горад» Рабэрта Раселіні — першая ў пасляваеннай трылогіі аўтара побач з фільмамі «Пайза» («Зямляк») і «Германія, год нулявы». Яна ахоплівае апошнія месяцы акупацыі Рыма, калі над германскай уладай ужо навіс немінучы крах, а італьянскае супраціўленне атрымлівае надзею на збаўленне, якая адчуваецца амаль шостым пачуццём. У гэты момант кожны рымлянін — агульны вобраз закатаванага чалавека і паўсталай свядомасці. І кожны тут — герой, які змагаецца з жорсткасцю і бесчалавечнасцю ворага. Здавалася б — канец, уздыхнуць бы хутчэй і зажыць сваім жыццём, адбудаваць яго, светлае і шчаслівае. Але расправа ворага, які ўсведамляе хуткі пройгрыш, напаследак становіцца яшчэ больш жорсткай.



Рабэрта Раселіні чакаў вызвалення Італіі як магчымасці здымаць фільм (падчас вайны ён вымушаны быў прыпыніць здымкі карціны «Таварная станцыя» з-за палітычных падзей), і 1945-ы стаў самым своечасовым годам для стварэння новага італьянскага мастацтва. Кінематаграфісты жыва адрэагавалі на новы стан Італіі, новае жыццё, аб'яднанне сацыяльных слаёў. У фільме «Рым, адкрыты горад» таксама дзейнічаюць прадстаўнікі розных узроўняў (раздзел, які тут ужо не важны) — святар, камуніст і простая жанчына, звычайная гаспадыня дома (яе сыграла прыгажуня Ганна Маньяні). Галоўнае тут — не стан, не адукацыя, не выхаванне, а тое, што дапамагае супрацьстаяць ворагу і трымаць пры гэтым галаву высока.

Натурныя здымкі, удзел непрафесійных акцёраў, звычайных хлопчыкаў з вуліц, адлюстраванне разбітых змрочных кварталаў, дамоў і двароў — усё з паэтычнай бясконцай любоўю да сапраўднага чалавека і яго штодзённага подзвігу.

Карціна атрымала Вялікі прыз Канскага кінафестывалю. Імпульс новаму італьянскаму кіно быў дадзены моцны — за стужкай «Рым, адкрыты горад» выйшлі «Выкрадальнікі веласіпедаў» Віторыа дэ Сіка, што яшчэ гучней заявіла пра неарэалізм і прыцягнула ўвагу да італьянскіх кінавытворцаў. І «Трагічнае паляванне» Джузэпэ дэ Санціса, і «Зямля дрыжыць» Лукіна Вісконці... Цэлая тэндэнцыя, якая пачыналася з простага, эмацыйнага фільма «Рым, адкрыты горад».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## Zамор'е

### СЭЛФІ КАРДАШ'ЯН РАСКУПІЛІ ЗА ХВІЛІНУ

**Лімітаваны наклад зборнікаў сэлфі* тэлезоркі Кім Кардаш'ян, які паступіў у анлайн-продаж, быў раскуплены менш чым за адну хвіліну.**



Прыхільнікам амерыканскай славутасці дасталася 500 асобнікаў кнігі з аўтографам Кардаш'ян, кошт кожнага фотаальбома склаў 60 долараў. Зборнікі сэлфі-здымкаў Кім пад назвай Selfish паступілі ў продаж у якасці прома-акцыі перад афіцыйным рэлізам выдання, які адбудзецца ў маі. У кнізе 352 старонкі, сярод фота 115 здымкаў дэкальтэ Кардаш'ян, 23 вывы яе ягадзіц, 10 сэлфі ў аголеным выглядзе. Пра намер выдаць зборнік сваіх «самастрэлаў» Кардаш'ян абвясціла ў жніўні 2014 года.

34-гадовая Кім Кардаш'ян праславілася пасля выхаду рэаліці-шоу «Сям'я Кардаш'ян», прэм'ера якога адбылася ў 2007 годзе на амерыканскім тэлеканале «Е!»; у яе 30 мільёнаў падпісчыкаў у сацыяльнай сетцы Instagram, дзе яна часта публікуе свае сэлфі-здымкі.

** здымак самога сябе на фотакамеру.*

### АГЕНТЫ ПАТАЎСЦЕЛІ

**Упершыню за 16 гадоў кіраўніцтва ФБР абавязала сваіх супрацоўнікаў здаваць нарматывы па фізпадрыхтоўцы, таму што за апошнія гады яны прыкметна набралі лішнюю вагу.**

Нарматывы па фізпадрыхтоўцы былі зноў уведзены ў ФБР у канцы мінулага года. Традыцыя сачыць за вагой сваіх супрацоўнікаў была закладзена першым дырэктарам ведамства Эдгарам Гуверам. Пасля падзей 11 верасня 2001 года супрацоўнікі ФБР, якія некалі актыўна працавалі «ў полі», сталі надаваць больш увагі аналітыцы, павялічыўся і аб'ём кабінетнай працы. У выніку «некаторыя супрацоўнікі набралі лішнюю вагу, іншыя сталі скардзіцца на пастаянныя пачуцці трывогі і дэпрэсію». Тэсты па фізпадрыхтоўцы цяпер абавязаны здаваць усе 13,5 тысячы агентаў ФБР па ўсім свеце.

### КОТ БЛІЖЭЙШЫ ЗА ЦЕШЧУ?

**Многія брытанцы лічаць сваіх свойскіх жывёлін больш блізкімі, чым некаторых членаў сям'і.**




Удзельнікаў сацыялагічнага даследавання, праведзенага рытэйлерам Matalan, папрасілі пералічыць, каго яны лічаць найбольш блізкімі і роднымі. Большасць, як і чакалі эксперты, на першае месца паставіла мужа/жонку, а таксама дзяцей. А вось больш як пятая частка — 22% апытаных — заявілі, што лічаць самай роднай душой свайго хатняга гадаванца! Пры гэтым бацькоў мужа/жонкі згадалі толькі 21% рэспандэнтаў.

Як лічаць спецыялісты, у апошнія гады ўсё больш выразна прасочваецца тэндэнцыя, што свойскія жывёлы многім становяцца бліжэй за сяброў і нават сваякоў. Магчыма, адзначаюць эксперты, гэта сведчыць пра рост маштабу праблемы адзіноты ў сучасным свеце і пра тое, што людзі разучыліся паўнавартасна камунікаваць адно з адным...

**Іван КУПАРВАС.**

## НЯДЗЕЛЯ, 10 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.10** Існасць.
**7.35 Драма «Шпіталь».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.55 Камедыя «Кухня».**
**10.40** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка перадач.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30 Кінааповесць «Ляцяць жураўлі».**
**17.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Славенія — ЗША.
**19.35, 23.15 Серыял «Не пакідай мяне!». 1—4-я серыі.**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.20** Дыялогі пра цывілізацыю.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.50 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Ладага». 1-я — 4-я серыі.**
**10.30, 20.05** Тэлебарометр.
**10.35** «Fitnews».
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**12.00 Да 70-годдзя Перамогі. Кінааповесць «Афіцэры».**
**13.35 Серыял «Мама — дэтэктыў».**
**15.40 Баявік «Перавозчык».**
**17.25 Баявік «Перавозчык-2».**
**19.15** Суперлато.
**20.35** Кіпень.
**21.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Тры дні лейтэнанта Краўцова». 1-я — 4-я серыі.**
**1.20** Вышэй за дах.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.25, 13.05, 18.55, 23.35** Калейдаскоп.
**7.35** «Нацыянальная трылогія: Гімн, Герб, Сцяг». Дак. фільм.
**8.15 «Быў месяц май». Драма.**
**10.05** Гала канцэрт XVIII тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда».
**11.00** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: гурт СССР.
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.05, 17.15** «Размаўляем па-беларуску».
**12.10** Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
**13.15 «Нармандыя-Нёман». Драма.**
**15.09** «Музыка ваенная». Дак. фільм.
**15.50 «Свінарка і пастух». Камедыя.**
**17.20 «Пасажырка». Меладрама.**
**19.05 «Рым, адкрыты горад». Драма.**



**20.45** Калыханка.
**21.05 «У стылі jazz». Камедыя.**
**22.35** «Камертон». Станіслаў Гаварухін.
**23.00** «Культпрасвет».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 3.35** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Тэніс. Турнір ВТА. Мадрыд. Фінал.
**9.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь — Расія.
**11.40, 1.30** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.10** Формула-Е. Гран-пры Манака.
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — КПР.
**17.25** Фактар сілы.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Ліверпуль».
**19.55** Аўтаспорт. Velcom — чэмпіянат Беларусі па дрыфтынгу. Першы этап.
**21.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Расія.
**23.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Канада.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
**9.35** Бесталковыя нататкі.
**9.55** Пакуль усе дома.
**10.40** Фазэнда.
**11.10** «Брэйн-рынг».
**12.20** «Адваротны адлік». «Аперацыя «Сувораў». Кошт вызвалення».
**12.50 Маст. фільм «Балада пра салдата».**
**14.25 Кіно ў колеры. Маст. фільм «Нябесны ціхаход».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20 Маст. фільм «У чэрвені 41-га».**
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вызваленая Еўропа».
**22.00** «Легенды Live».
**22.45 Маст. фільм «Нашчадкі».**
**0.45 Камедыя «Партрэт дасканаласці».**

### СТБ

**6.10 Маст. фільм «Чакай мяне, Ганна».**
**7.20** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.40, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.10 Маст. фільм «І ты ўбачыш неба».**
**9.25 Маст. фільм «Нябесны ціхаход».**



**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40, 13.40, 23.40 Маст. фільм «А золкі тут ціхія». 1-я і 2-я серыі.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**15.25, 17.15** «Вайна вядомая і невядомая».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.45 Маст. фільм «Афіцэры».**
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «У жніўні 44-га».**
**22.40** «Зорны рынг».

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Ляцяць жураўлі».**
**7.50** М/ф.
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Серыял «Ялта 45».**
**14.00** «Ялцінскі трыумф».
**14.30, 17.20, 21.30 Серыял «Замах».**
**21.00** «Разам».
**22.10 Маст. фільм «Край».**
**0.20 Маст. фільм «Апошні раз, калі я бачыў Парыж».**
**3.45 Маст. фільм «Знішчальнікі».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Дыверсанты».**
**10.10 Маст. фільм «На сямі вятрах».**
**12.00 Маст. фільм «Добраахвотнікі».**
**14.00, 20.00** Весткі.
**14.20, 21.05 Серыял «Заяц, смажаны па-берлінскі».**
**22.35** «Штурм Берліна. У логаве звера».
**23.30** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «ППС».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.15 Драма «Белы тыгр».**
**15.05, 16.20 Маст. фільм «Ваўкі».**
**17.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.25 Серыял «Ляснік».**
**22.55 Маст. фільм «Вецер паўночны».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 14.40, 18.40, 21.00** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
Паводле пісьма **васьмікласніцы гімназіі №3 г. Гродна Настассі ФІЛІН**, у ім, тым свеце, будзе багата розных фарбаў. Па-першае, чырвоны, колеру цяпла і радасці, колеру памяці пра тых, хто заваёўваў мір. Па-другое, там будуць усе адценні зялёнага — колеру травы, надзеі і маладосці. Па-трэцяе, не абысціся без блакітнага — колеру нашых мар... Як і без... чорнага — колеру свежаўзаранай урадлівай зямлі.

На думку **васьмікласніцы Дар'і ІКСАНАВАЙ (гімназіі імя Ліхоты з Жыткавіч)**, у свеце, дзе хацелася б вырасці, ну безумоўна ж, не месца войнам і голаду, невылечным хваробам (бо «немагчыма адчуваць сябе шчаслівым, калі некаму дрэнна»). А вось пэўныя цяжкасці — для загартоўкі характару — дзяўчынка пакінула б... І кожнаму дарычыла б займацца выключна любімай справай, бо, згадзіцеся, і сапраўды «неразумна траціць жыццё на тое, што не любіш»... А яшчэ Дар'я ліквідавала б межы, каб чалавек мог купіць білет і паехаць куды захоча.

У маім свеце не будзе пакінутых дзяцей, чые бацькі аддалі перавагу забавам і п'янкам. Бацькі будуць больш увагі ўдзяляць дзецям, разам з імі праводзіць вольны час, а не адгароджвацца ад іх працай, — разважае **шасцікласніца Глыбоцкай раённай гімназіі Кацярына СТРАЛКОЎСКАЯ.** — У маім свеце людзі не будуць гінуць ад алкаголю, ад розных спайсаў, наркотыкаў.

Свет Кацярыны — гэта свет аптымістаў, свет людзей працы, свет здароўя. І ён не фантастычны, а самы рэальны, калі, вядома ж, прыкласці намаганні...

Свет **дзевяцікласніка СШ №1 г. Пінска Ягора ФАДЗЕЕВА** ствараюць і ўпрыгожваюць сабой людзі. Яны бескарыслівыя і велікадушныя, верныя і гуманныя, добрыя і законапаслухмяныя, міласэрныя і талерантныя, храбрыя, шчодрыя, вясёлыя. І кожны з іх любіць сваю краіну, творыць сваё шчасце.

«Мне хацелася б вырасці ў свеце, дзе кожны чалавек усведамляе сваю выключнасць, дзе ўсе людзі хочуць здзяйсняць свае мары, дзе чуюць «я» сваіх блізкіх, дзе ўмеюць дзяліць з імі радасць і боль», — піша **васьмікласніца Нясвіжскай гімназіі Ганна ГУБАР.**

Варты цытавання і ліст **сямікласніка Магілёўскай гімназіі №1 Ягора ДУВАЛАВА.** «Хачу жыць у свеце, дзе кожнаму дзіцяці ўсяго хапае. Хапае таго, чаго хочацца. Напрыклад, стаяла б у мяне на кухні такая машына: кідаеш у яе звычайную бульбу і атрымліваеш пахкія, хрусткія чыпсы. Ніэдрэнна было б побач з кранам халоднай і гарачай вады ў кожным доме ўсталяваць кран, з якога цякло б малако. Тады па яго не трэба было б бегаць у краму альбо трымаць у гаспадарцы карову...»

Яшчэ адна мара ў Ягора, каб дзеці хадзілі ў школу з задавальненнем, каб там яны даследавалі тое, што ім сапраўды цікава, ставілі доследы, займаліся творчасцю.

«...Бог зляпіў чалавека з гліны, і засталася ў яго адзін невыкарыстаны кавалак.

— Што яшчэ зляпіць табе? — спытаў Бог.

— Зляпі мне шчасце, — папрасіў чалавек.

Нічога не адказаў Бог, а толькі паклаў чалавеку ў далонь кавалачак гліны».

З гэтай прывесці пачынае свой ліст у Лондан да сябра Пола, які па-англійску чытае Пушкіна, **дзевяцікласнік СШ №124 г. Мінска Павел МІХАЛАП.** Як і належыць у ліставанні, ён узгадвае ранейшыя сустрэчы з Полам і агульных знаёмых, распытвае і расказвае пра сямейнікаў. А далей піша пра той самы свет, у якім ці не ўсе цяпер сварацца з-за грошай, молячыся золату, забываюць аб простых, але вельмі моцных каштоўнасцях: любові, дабрыні, чалавечнасці. І далей: «Я хацеў бы вырасці ў свеце, дзе за кожным чалавекам хадзіла б шчасце. Каб яно, гэта шчасце, было ў кожнай пражытай хвіліне, у кожным пражытым дні, і каб кожны з удзячнасцю мог прымаць усё тое, што дае яму жыццё.

Але чалавеку, каб быць шчаслівым, неабходна кахаць і быць каханым.

Я хацеў бы вырасці ў свеце, дзе ёсць любоў! Любоў без краю, любоў вялікая і бескарыслівая, верная і адданая.

Я хацеў бы вырасці ў свеце, дзе ёсць дабрыня! Жаданне дапамагчы камусьці проста так, а не таму, што выгадна.

Я хацеў бы вырасці ў чалавечным свеце! Дзе кожны ўспрымаў бы чужы боль як свой і быў бы гатовы прыйсці на дапамогу раней, чым бяда, каб спыніць, выратаваць, захаваць...

Я не хацеў бы вырасці ў свеце, дзе ад злосці зводзіць скулы, дзе ад чужой сквапнасці гінуць людзі, дзе ад гора плачуць маці ля магіл сваіх сыноў!

Ты ведаеш, — разважае Павел далей, — мне часам здаецца, што свет паволі з'язджае з глузду. Егіпет, Сірыя, Францыя, Данбас... Я нядаўна ўбачыў фотаздымак у інтэрнэце. Рэальны хлопчык з Данецка Дзіма Вараб'ёў у бальнічнай палаце, увесь у бінтах... Яму асколкам снарада адарвала ногі, руку, ён зусім нічога не бачыць... А яму толькі дзевяць гадоў! За што, Пол? Як яму цяпер жыць? Я раптам уявіў сябе на яго ным месцы. Страшна. Вельмі страшна! Не, у свеце, у якім я хачу вырасці, няма месца вайне, злосці, варожасці...»

Як і ў мінулыя гады, вынікі конкурсу на самы лепшы ліст падводзіцца ў тры этапы: спачатку пераможцы вызначаліся на раённых узроўнях, потым — на абласных, і, нарэшце, сем прац (па адной ад кожнай вобласці і горада Мінска) трапілі на суд журы рэспубліканскага. Яму, ну вядома ж, было што абмеркаваць, было пра што паспрачацца. У выніку чаго **трэцяе месца** прысуджана **васьмікласніцы гімназіі імя Ліхоты з г. Жыткавічы Дар'і ІКСАНАВАЙ, дзевяцікласніку СШ №1 г. Пінска Ягору ФАДЗЕЕВУ, васьмікласніцы Нясвіжскай гімназіі Ганне ГУБАР і шасцікласніцы Глыбоцкай раённай гімназіі Кацярыне СТРАЛКОЎСКАЙ. На другім месцы** работы **васьмікласніцы гімназіі №3 г. Гродна Настассі ФІЛІН і сямікласніка Магілёўскай гімназіі №1 Ягора ДУВАЛАВА.** Яму, дарэчы, толькі аднаго голасу не хапіла да першага месца, якое прысуджана **дзевяцікласніку СШ №124 г. Мінска Паўлу МІХАЛАПУ.**

Менавіта яго ліст будзе накіраваны ў Міжнароднае бюро Сусветнага паштовага саюза для ўдзелу ў 44-м міжнародным эпісталярным конкурсе 2015 года.

Што да гэтага дадаць? Хіба шчырыя спадзяванні на тое, што высокую адзнаку рэспубліканскага журы падтрымае яшчэ і міжнароднае (што, дарэчы, з лістамі нашых школьнікаў ужо здаралася, прычым не раз...). І тады Павел Міхалап, а таксама яго настаўніца рускай мовы і літаратуры Аксана Барысаўна Любамірская будуць адзначаны дыпломамі-падзякамі ды прызамі не толькі ад РУП «Белпошта», але і Сусветнага паштовага саюза.

А яшчэ — на тое, што сярод лепшых лістоў, прадстаўленых на разгляд рэспубліканскага журы ў наступным годзе, будуць работы, напісаныя па-беларуску.

**Валянціна ДОЎНАР**

■ Напярэдадні

# Курс — на Астраву

## Заўтра ў Чэхіі стартуе чэмпіянат свету па хакеі

**Зборная Беларусі выступіць ў групе B, якая будзе гуляць на «CEZ-Арэне» ў Астраве. Наша каманда ўступіць у барацьбу 2 мая, яе першым сапернікам стане зборная Славеніі.**



Фота БЕЛТА.

**Напярэдадні ад'езду на чэмпіянат свету зборная каманда краіны ўсклала кветкі да абеліска Перамогі ў Мінску.**

У рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету беларусы правялі паядынкі Еўравыкліку. Выступленне падапечных **Дэйва Льюіса** атрымалася неадназначным: у двюх хатніх гульнях супраць зборнай Латвіі яны здолелі перамагчы толькі ў першай. Два гасцявыя матчы з датчанамі аказаліся для беларускай дружыны няўдалымі. Далей беларусы ў гасцях вырвалі перамогу ў славакаў (па булітах), аднак у паўторнай сустрэчы саступілі ім. Заключныя матчы з нарвежцамі таксама атрымаліся паспяховымі толькі напалову: адна перамога і адно паражэнне.

Склад нашай зборнай у апошніх гульнях з нарвежцамі быў максімальна набліжаны да таго, што выступіць у Астраве. Дэйв Льюіс пасля завяршэння Еўравыкліку адзначыў, што першым нумарам сярод варатароў стане Кевін Лаланд, не дапамогуць зборнай на чэмпіянаце свету Канстанцін Кальцоў і Уладзімір Дзянісаў.

— Сумняваюся, што яны далучацца. Дакладней нават так: упэўнены на 99,9 працэнта, што іх з намі не будзе, — адзначыў галоўны трэнер беларусаў.

Міхаіл Грабоўскі скончыў выступленне за акіянам, зараз яго чакаюць у зборнай. Нагадаем: Грабоўскі вярнуўся на лёд зусім нядаўна пасля цяжкага страсення мозга.

З прычыны траўмаў чэмпіянат свету прапусцяць Дзмітрый Мялешка і Аляксей Угараў, таксама ў Чэхію не прыедуць Раман Грабарэнка і Джэф Плат.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

**Склад папярэдніх груп:**

**Група А** (Прага):
1.Швецыя, 2.Канада, 3.Чэхія, 4.Швейцарыя, 5.Латвія, 6.Францыя, 7.Германія, 8.Аўстрыя.

**Група В** (Астрава):
1.Фінляндыя, 2.Расія, 3.ЗША, 4.Славакія, 5.Нарвегія, 6.Беларусь, 7.Данія, 8.Славенія.

**Каляндар гульняў зборнай Беларусі на першым этапе ЧС-2015:**

**2 мая.** БЕЛАРУСЬ — Славенія (17.15)
**3 мая.** БЕЛАРУСЬ — Славакія (17.15)
**5 мая.** Данія — БЕЛАРУСЬ (17.15)
**7 мая.** ЗША — БЕЛАРУСЬ (17.15)
**9 мая.** БЕЛАРУСЬ — Расія (13.15)
**11 мая.** Фінляндыя — БЕЛАРУСЬ (17.15)
**12 мая.** Нарвегія — БЕЛАРУСЬ (13.15).

Па выніках папярэдняй стадыі па чатыры найлепшыя каманды кожнай групы выходзяць у чвэрцьфінал, а зборныя, якія апынуліся на апошніх месцах, страцяць прапіску ў элітным дывізіёне.

■ Кінакрокі

# ТРАДЫЦЫЮ ПАНАВАННЯ ВАЕННАГА КІНО

## працягне Эмір Кустурыца

**Сербскі ці, як ён сам сябе называе, югаслаўскі рэжысёр Эмір Кустурыца будзе здымаць свой чарговы фільм у Беларусі. Гэта будзе карціна «Калі не цяпер, то калі?» пра партызанскую барацьбу падчас Другой сусветнай вайны, заснаваная на аднайменным рамане вядомага італьянскага пісьменніка Прыма Леві. Праект будзе рэалізаваны кінастудыяй «Беларусьфільм» і французскай кампаніяй Cinema Solei, якія восенню 2014 года заключылі мемарандум аб сумеснай вытворчасці паўнаметражнага ігравога фільма рэжысёра.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Эмір Кустурыца прыляцеў у Беларусь у панядзелак, каб агледзець лакацыі і натурныя пляцоўкі нацыянальнай кінастудыі, вытворча-тэхнічная база якой будзе задзейнічана ў здымках. Акрамя беларускай тэрыторыі і беларускай гісторыі, у фільме будуць удзельнічаць нашы акцёры. Тут адзначылі здольнасць Эміра Кустурыцы працаваць з любымі замежнымі акцёрамі, таму што на яго пляцоўцы ўсе працуюць, як яму трэба. Сам рэжысёр сказаў: «Я не люблю здымаць «зорак», а пры згадванні Монікі Белучы (якая іграе ў бягучым фільме аўтара) канстатаваў: «Моніка Белучы не «зорка» — яна ікона». Тым не менш ні гучныя, ні звычайныя імёны ў праекце фільма «Калі не цяпер, то калі?» не фігуруюць: для падрабязнасцяў яшчэ не прыйшоў час, здымкі будуць праходзіць толькі ў 2017 годзе.

Ужо гатовы першы варыянт сцэнарыя. «Ён заснаваны на літаратуры, магчыма, самага лепшага італьянскага пісьменніка. Гэта аповед пра партызанаў, якія падчас Другой сусветнай вайны пешшу ідуць тысячы кіламетраў з Беларусі ў Італію. Што з імі будзе? Другая сусветная вайна тут паказваецца на фоне неанацызму: г.зн. дзеянне будзе развівацца ў мінулым і ў нашы часы», — сказаў Эмір Кустурыца.

Раман Прыма Леві, апублікаваны ў 1982 годзе, расказвае пра яўрэйскіх партызанаў на акупаванай немцамі тэрыторыі, якія змагаюцца з ворагамі і трымаюць шлях у далёкую Палесціну, каб стварыць там яўрэйскую нацыянальную дзяржаву. Сам Леві падчас вайны быў у шэрагу італьянскіх партызанаў, прайшоў некалькі канцлагераў, пасля якіх пешшу дабіраўся дадому. Сёння яго літаратуру вывучаюць італьянскія школьнікі.

Сцэнарый карціны напісаны Кустурыцам сумесна з Горданам Міхічам. «Я адчуваю, што тут можна зрабіць вельмі моцны фільм. Тэма Другой сусветнай актуальная, нам трэба працаваць дзеля таго, каб людзі зразумелі, што здарылася падчас гэтай вайны. Я не хачу рабіць імпрэсіўны галівудскі фільм — толькі паказаць тое, што Прыма Леві напісаў. Гэта будзе сур'ёзная карціна з элементамі камедыі», — расказаў аўтар.

Эмір Кустурыца — адзін з самых яскравых сучасных рэжысёраў, яго фільмы адметныя трагікамедыйным жанрам, фарсам, сюррэалізмам, эклектыкай, фантасмагарызмам, яго ставяць у шэраг аўтараў магічнага рэалізму. Эмір Кустурыца з'яўляецца акцёрам, музыкантам, арганізатарам кінафестывалю, уладальнікам дзвюх Пальмавых галін Канскага кінафестывалю (атрыманне галоўнай узнагароды двойчы — рэдкая з'ява ў гісторыі прэстыжнага форуму) і ўвогуле шчаслівым трыумфатарам міжнародных кінафестываляў.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | на 1 января 2015 года | на 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 17 702 881 | 16 293 650 |
| Нематериальные активы | 120 | 75 940 | 84 558 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | – | – |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | – | – |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | – | 1 016 565 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 24 308 | 24 308 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 628 209 | 396 545 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | – | 163 253 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **18 431 338** | **17 978 879** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 193 151 | 185 229 |
| в том числе: материалы | 211 | 193 151 | 185 229 |
| незавершенное производство | 212 | – | – |
| прочие запасы | 213 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 220 | 50 681 | 30 841 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | 787 037 | 811 699 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 1 117 314 | 2 199 664 |
| в том числе: резерв незаработанной премии | 241 | 958 072 | 1 670 811 |
| резервы убытков | 242 | 159 242 | 528 853 |
| другие технические резервы | 243 | – | – |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 13 207 555 | 15 827 205 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 46 601 443 | 44 449 765 |
| в том числе: касса | 271 | 28 146 | 11 171 |
| депозитные счета | 272 | 45 901 960 | 43 703 710 |
| эквиваленты денежных средств | 273 | – | – |
| прочие денежные средства | 274 | 671 337 | 734 884 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | – | 3 911 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **61 957 181** | **63 508 314** |
| **БАЛАНС** | **300** | **80 388 519** | **81 487 193** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | на 1 января 2015 года | на 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 18 300 000 | 15 100 000 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 2 741 341 | 2 003 107 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | – | – |
| Добавочный капитал | 450 | 4 115 067 | 5 620 206 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | 98 067 | 485 126 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 4 029 030 | 3 315 234 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **29 185 438** | **26 038 547** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | – | – |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 37 196 435 | 44 342 162 |
| Резервы убытков | 502 | 6 341 744 | 6 959 630 |
| Другие технические резервы | 503 | – | – |
| Иные страховые резервы | 504 | – | – |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 99 593 | 109 721 |
| Гарантийные фонды | 506 | – | – |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **43 637 772** | **51 411 513** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | – | – |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 2 422 746 | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **2 422 746** | – |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 870 524 | – |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 4 272 039 | 4 037 133 |
| в том числе: страхователям | 631 | 3 948 | 2 204 |
| страховым агентам и страховым брокерам | 632 | 1 458 777 | 1 077 110 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 645 376 | 413 794 |
| по операциям перестрахования | 634 | 566 456 | 1 909 781 |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | – | – |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 82 746 | 74 757 |
| по авансам полученным | 637 | – | – |
| по налогам и сборам | 638 | 605 551 | – |
| по социальному страхованию и обеспечению | 639 | 127 137 | 89 971 |
| по оплате труда | 640 | 324 271 | 222 486 |
| по лизинговым платежам | 641 | 186 812 | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 642 | – | – |
| прочим кредиторам | 643 | 270 965 | 247 030 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 650 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 660 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 670 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 680 | – | – |
| **ИТОГО по разделу VI** | **690** | **5 142 563** | **4 037 133** |
| **БАЛАНС** | **700** | **80 388 519** | **81 487 193** |

КЕНТАВР СТРАХОВОЕ ОБЩЕСТВО

Закрытое акционерное страховое общество

# «КЕНТАВР»

www.ken.by

Учетный номер плательщика: 100985903
Вид экономической деятельности: Страхование иное, чем страхование жизни
Организационно-правовая форма: Закрытое акционерное общество
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 172

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

| Наименование показателей | Код строки | за январь-декабрь 2014 года | за январь-декабрь 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто | 010 | – | – |
| Страховые выплаты | 020 | – | – |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -) | 030 | – | – |
| в том числе изменение резерва дополнительных выплат | 031 | – | – |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | – | – |
| Расходы на ведение дела | 050 | – | – |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 055 | – | – |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 056 | – | – |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни** (строки 010 - 020 + (030 - 031) - 040 - 050 + 055 - 056) | **060** | – | – |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 065 | – | – |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 066 | – | – |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (строки ± 060 + 065 - 066) | 069 | – | – |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто – всего | 070 | 49 582 188 | 81 612 190 |
| в том числе: по прямому страхованию и сострахованию | 071 | 43 516 798 | 62 638 796 |
| по рискам, принятым в перестрахование | 072 | 6 065 390 | 18 973 394 |
| Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто | 073 | 1 089 353 | 3 752 106 |
| Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073) | 074 | 48 492 835 | 77 860 084 |
| Изменение резерва незаработанной премии, брутто | 080 | 7 145 727 | (22 219 347) |
| Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии | 081 | (712 739) | 977 158 |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081) | 082 | 6 432 988 | (21 242 189) |
| Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082) | 085 | 54 925 823 | 56 617 895 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто | 090 | 50 941 581 | 49 432 515 |
| Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах) | 091 | 1 603 280 | 2 000 080 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091) | 092 | 49 338 301 | 47 432 435 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто | 095 | 617 886 | (2 714 984) |
| Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат) | 096 | (369 611) | 206 451 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с у четом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096) | 097 | 248 275 | (2 508 533) |
| Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097) | 100 | 5 835 797 | 6 676 927 |
| Изменение других технических резервов | 110 | – | – |
| Изменение иных страховых резервов | 120 | – | – |
| в том числе увеличение специального страхового резерва по обязательному страхованию с государственной поддержкой урожая сельскохозяйственных культур, скота и птицы за счет дохода, полученного от инвестирования этого резерва | 121 | – | – |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 130 | 129 679 | 166 088 |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 140 | – | – |
| Расходы на ведение дела, всего | 150 | 17 814 510 | 17 266 034 |
| в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 151 | 744 100 | 2 692 800 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 155 | 174 116 | 570 955 |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 160 | 7 432 852 | 7 275 712 |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 165 | 1 821 624 | 61 783 |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни** (строки 100 + 110 + (120 – 121) – 130 – 140 – 150 + 155 + 160 – 165) | **170** | **(6 323 048)** | **(2 970 311)** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 175 | 3 512 164 | 2 188 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 176 | 207 398 | 224 226 |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности по видам страхования иным, чем страхование жизни** (строки ± 170 + 175 - 176) | **179** | **(3 018 282)** | **(3 192 349)** |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 180 | 6 519 595 | 8 428 140 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 181 | 3 537 790 | 4 460 145 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 182 | 3 606 | 6 566 |
| проценты к получению | 183 | 2 978 199 | 3 961 429 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 184 | – | – |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 190 | 3 140 745 | 4 221 059 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 191 | 3 140 745 | 4 221 059 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 192 | – | – |
| Доходы по финансовой деятельности | 200 | 21 049 673 | 4 121 044 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 201 | 5 075 263 | 3 164 830 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 202 | 15 974 410 | 956 214 |
| Расходы по финансовой деятельности | 210 | 16 983 145 | 1 341 203 |
| в том числе: проценты к уплате | 211 | 155 650 | 154 169 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 212 | 839 383 | 233 189 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 213 | 15 988 112 | 953 845 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (строки 180 – 190 + 200 – 210) | 220 | 7 445 378 | 6 986 922 |
| в том числе доход от инвестирования специального страхового резерва по обязательному страхованию с государственной поддержкой урожая сельскохозяйственных культур, скота и птицы, направленный на увеличение этого резерва | 230 | – | – |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** (строки ± 069 ± 179 ± 220 – 230 + 031) | **240** | **4 427 096** | **3 794 573** |
| Налог на прибыль | 250 | 1 089 243 | 883 045 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 260 | (163 253) | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 270 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 280 | – | – |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 285 | – | – |
| **Чистая прибыль (убыток)** (строки ± 240 – 250 ± 260 ± 270 – 280 – 285) | **290** | **3 174 600** | **2 911 528** |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 300 | – | 1 603 206 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 310 | – | – |
| **Совокупная прибыль (убыток)** (строки ± 290 ± 300 ± 310) | **320** | **3 174 600** | **4 514 734** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 330 | – | – |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 340 | – | – |

Руководитель С.А.Прохорчик

Главный бухгалтер Т.В.Толкачева

## ЧАСТНОЕ АУДИТОРСКОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «АУДИТ-КОНТО»

220029, г. Минск, пр-т Машерова, д. 9, комн. 312, т/ф (017) 2374005, моб. (029) 640-64-37, e-mail: audit-konto@mail.ru

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ ЗАСО «КЕНТАВР» за период с 01.01.2014 г. по 31.12.2014 г.

*Генеральному директору Прохорчику Сергею Александровичу*

РЕКВИЗИТЫ АУДИРУЕМОГО ЛИЦА:
Наименование организации: Закрытое акционерное страховое общество «КЕНТАВР»
Местонахождение: 220141, г. Минск, пр-т Независимости, 172
Сведения о государственной регистрации:
дата государственной регистрации 23.11.2001г.
регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №100985903.

РЕКВИЗИТЫ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ:
Наименование аудиторской организации: Частное аудиторское унитарное предприятие «Аудит-конто»
Местонахождение: 220029, г. Минск, пр-т Машерова, д. 9, комн. 312
Сведения о государственной регистрации:
дата государственной регистрации 01.02.2007 г.
регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №190799512.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности *ЗАСО «КЕНТАВР»*, состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2014 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

ОБЯЗАННОСТИ РУКОВОДСТВА АУДИРУЕМОГО ЛИЦА ПО ПОДГОТОВКЕ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Руководство *ЗАСО «КЕНТАВР»* несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

ОБЯЗАННОСТИ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности *ЗАСО «КЕНТАВР»*, а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля *ЗАСО «КЕНТАВР»*, необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности *ЗАСО «КЕНТАВР»*.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность *ЗАСО «КЕНТАВР»* достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение *ЗАСО «КЕНТАВР»* на 31.12.2014г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения *ЗАСО «КЕНТАВР»* за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Директор
Частного предприятия
«Аудит-конто» Гапанович А. Г.

Дата подписания аудиторского
заключения по бухгалтерской отчетности
«25» февраля 2015 г.

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 03 июня 2015 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1 | Помещение на 2 этаже, расположенное в капитальном строении (инв. №130/С-35420) – отделение почтовой связи, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, д. 13а | 1 665 000 | 166 500 | 55,50 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды** |
| **Наименование арендодателя** | **РУП «Белпочта»** |
| **Срок договора аренды** | **Не менее 3-х лет** |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в рег. дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 03 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

**1.** Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

**2.** Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

**3.** Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**4.** Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**5.** Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**6.** Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

**7.** При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.**

**Последний день приема заявлений – 02 июня 2015 г. до 17.00.**

**Контактные тел.: 8-(0162)-23-92-59, 21-88-81.**

■ Імпрэза

# КАРНАВАЛЬНЫ ГОРАД

## Камедыянты і цыркачы ідуць у народ

**Венецыя ці Рыа далёка. Дый годзе! Рыхтуйце маскі: трэці мінскі карнавал выходзіць на вуліцы сталіцы. Цудоўнай пляцоўкай для відовішчаў стануць вуліцы горада. Прычым не толькі падчас карнавальнага шэсця. Таму што на трэцім Мінскім форуме вулічных тэатраў упершыню выступяць артысты цырка і нават прафесійны рэпертуарны тэатр.**



Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага займеў на пачатку сезона спектакль «Viva, Commedia!» (дзякуючы аўтару п'есы Рыкарда Піпа і рэжысёру Матэа Сп'яцы). Гэта ж тое, што трэба: камедыя дэль артэ, якая некалі пачыналася на вуліцах Італіі, будзе прадстаўлена 1 мая ўвечары пад адкрытым небам у Мінску. Сцэна — пляцоўка ля плошчы Свабоды. Тэатр нараджаецца на вачах, у вулічным асяродку. Дэкарацыі натуральныя. Артысты працаваць будуць гуляючы: яны ж прафесіяналы. Як сапраўдныя камедыянты, яны пачынаюць, задаюць тон для таго самага чароўнага карнавальнага шэсця, якое ўжо ў суботу апоўдні. Хто сказаў, што там не можа быць вас?

Найперш, вядома, рыхтуюцца самі ўдзельнікі форуму: сёлета чакаецца каля 200 артыстаў. Прычым да нас едуць госці з-за мяжы: Польшчы, Расіі, Прыднястроўя, Францыі. Цырк імя Жуля Верна загартаваны выступленнямі на фестывалях вулічных тэатраў, адзін з самых старэйшых адбываецца ў родным Ам'ене. Але ў Мінску выступіць першы раз, затое і 2, і 3 мая варта чакаць французскіх цыркачоў на пляцоўцы каля ратушы.

Пляцовак насамрэч некалькі: задзейнічаны адваротны бок ля канцэртнай залы «Верхні горад», пляцоўка ля Карэтнага дворыка. Праграма складзена вельмі шчыльна: за два дні нас чакае больш за 20 паказаў у самых розных жанрах. Самае прыемнае тое, што пераканаўчую большасць спектакляў (і наогул сустрэч з гледачамі) падрыхтавалі айчынныя вулічныя тэатры. Яны прапануюць здзейсніць падарожжы ў часе, азірнуцца вакол і ўбачыць тых, хто побач, прапануюць далучыцца кожнаму і стаць больш адкрытым для радасці, навучаць бачыць радасць у малым. У нас цікавыя калектывы, накіраваныя на розныя праявы тэатральнай творчасці: ёсць эксперыментальныя, як тэатры «EYE» ці «Гогаль», псіхалагічнай і пластычнай імправізацыі («АКМЕ»), танцавальныя праекты («Альтанка» і «Адлюстраванне»), а яшчэ і студыя этнічнай пластыкі «KETRI»; умеюць зацягнуць у свае дзеі інтэрактыўны тэатр «42» ці «Мусташ», накіраваныя на ўзаемадзеянне. Ёсць тэатры з дзіўнымі і вельмі цёплымі назвамі: «Майстэрня ўражанняў», «Дом Сонца» (тэатр лялек, святла і ценю), вандроўны тэатрык «Гістрыён» і іншыя, прычым не толькі сталічныя. У папярэдне гады, калі пачаў ладзіцца форум, мы, звычайныя гараджане, да іх прыглядаліся. Прыглядаліся і прафесіяналы. І прызналі: годна, можна ўдзельнічаць. Таму як адкрыццё, так і фінал трохдзённага свята абяцае быць уражлівым. Увечары 3 мая на вуліцу выйдуць са сваёй праграмай артысты «Белдзяржцырка».

Таму ўсяго хопіць: арлекінаў, веліканаў на хадулях, людзей-скульптур, вандроўнікаў з часоў Сярэднявечча, танцораў, самых розных персанажаў з чалавечага і лялечнага свету, жанглёраў, акрабатаў і нават клоўнаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Надвор'е

## На святы — холадна і дажджы

### А у панядзелак — замаразкі да мінус 2

**Сёння тэрыторыя нашай краіны знаходзіцца у зоне павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, раніцай у асобных раёнах — туман. Тэмпература паветра ўдзень складзе 13-18 градусаў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.**

1 мая ўдзень з тэрыторыі Польшчы на захад краіны перамесціцца атмасферны фронт, а на паўночным усходзе адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць з Бранскай вобласці. Таму ўдзень месцамі, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-7 цяпла, удзень — плюс 11-18 градусаў, па поўдні месцамі ад 14 да 20 цяпла. У суботу надвор'е абумовіць франтальны раздзел з халоднымі паветранымі масамі балтыйскага паходжання. Чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Удзень у асобных раёнах па поўначы краіны трапіць у зону моцны вецер парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе 3-9 цяпла, удзень — плюс 9-16 градусаў. Даволі няўстойлівае надвор'е чакаецца і ў нядзелю, калі да нас завітае халоднае паветра з боку Скандынаўскага паўвострава.

**Сяргей КУРКАЧ**

Даты | Падзеі | Людзі

**30 КРАСАВІКА**

**1777** год — нарадзіўся Карл Фрыдрых Гаус, нямецкі матэматык, астраном і фізік. У 19 гадоў яму ўдалося вырашыць задачу, якая не паддавалася намаганням геаметрый з часоў Эўкліда: ён знайшоў спосаб, які дазваляе пабудаваць з дапамогай цыркуля і лінейкі правільны 17-вугольнік. На самога Гауса гэты вынік зрабіў такое моцнае ўражанне, што ён вырашыў прысвяціць сябе вывучэнню матэматыкі, а не класічных моў, як планаваў раней. Пасля распрацоўкі метаду вылічэння эліптычнай арбіты планеты, які з невялікімі зменамі выкарыстоўваецца і ў наш час, Гаус стаў вядомы ўсяму навуковаму свету. Працы вучонага аказалі ўплыў і на развіццё алгебры, матэматычнай фізікі, тэорыі электрычнасці і магнетызму.

**1883** год — нарадзіўся Яраслаў Гашак, чэшскі пісьменнік-сатырык. Аўтар рамана «Прыгоды бравага салдата Швейка падчас сусветнай вайны», апавяданняў і фельетонаў.

**1945** год — падчас штурму Берліна на подступах да рэйхстага савецкі воін, гвардыі сяржант М.І. Масалаў, рызыкуючы жыццём, вынес з-пад агню трохгадовую нямецкую дзяўчынку. Пасля вайны з ім сустрэўся скульптар Вучэціч, які вылепіў для кампазіцыі ў берлінскім Трэптаў-парку постаць воіна-вызваліцеля з выратаванай дзяўчынкай на руках, вобраз якога яму падказаў подзвіг савецкага салдата. «Да атакі гвардзейцаў засталося хвілін пяцьдзясят. Наступіла цішыня, як перад бурай, трывожная, напружаная. І раптам у гэтай цішыні, якая парушалася толькі трэскам пажараў, пачуўся дзіцячы плач. Нібы аднекуль з-пад зямлі, глуха і прызыўна гучаў голас дзіцяці. Плачучы, ён паўтараў адно, зразумелае ўсім слова: «Мутэр, мутэр...». «Здаецца, гэта на тым баку канала», — сказаў таварышам Масалаў. Ён падышоў да камандзіра: «Дазвольце выратаваць дзіця». Паўзці па Гарбатым мосце было небяспечна: ён прастрэльваўся агнём кулямётаў. Масалаў поўз наперад, прыціскаючыся да зямлі, часам хаваючыся ў неглыбокіх варонках ад снарадаў і мін. Вось ён перасёк набярэжную і схаваўся за выступам бетоннай сценкі канала. І тут зноў пачуў дзіця. Тое клікала маці жаласна, настойліва, быццам прыспешвала Масалава. Тады гвардзеец падняўся на ўвесь рост — высокі, магутны. Бліснулі на грудзях баявыя ордэны. Такога не спыняць ні кулі, ні асколкі»... Так апісваў гэты эпізод у сваіх мемуарах маршал В.І. Чуйкоў.



Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, пісьменнік, публіцыст:**

*«Але ж колькі не стой у цені, некалі ўсё роўна давядзецца зноў выходзіць на сонца».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.37 | 20.38 | 15.01 |
| Віцебск — | 5.22 | 20.32 | 15.10 |
| Магілёў — | 5.27 | 20.28 | 15.01 |
| Гомель — | 5.28 | 20.20 | 14.52 |
| Гродна — | 5.53 | 20.53 | 15.00 |
| Брэст — | 5.58 | 20.48 | 14.50 |

**Месяц**

*Першая квадра 25 красавіка. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр. Аляксандра, Ананіі, Івана, Сямёна, Фёдара. К. Катарыны, Лілії, Ігара, Людвіка, Мар'яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў маі

2, субота, 16.00 — 24.00
3, нядзеля, 0.00 — 4.00
5, аўторак, 3.00 — 13.30
7, чацвер, 19.00 — 20.30
9, субота, 21.30 — 24.00
11, панядзелак, 13.30 — 24.00
12, аўторак, 0.00 — 5.30
13, серада, 19.00 — 24.00
14, чацвер, 0.00 — 7.00
15, пятніца, 15.30 — 24.00
16, субота, 0.00 — 9.00
18, панядзелак, 6.00 — 11.30
19, аўторак, 20.00 — 24.00
20, серада, 0.00 — 16.00
22, пятніца, 4.30 — 21.00
24, нядзеля, 13.30 — 24.00
25, панядзелак, 0.00 — 11.30
27, серада, 4.30 — 23.30
29, пятніца, 22.30 — 24.00
30, субота, 0.00 — 12.30

## УСМІХНЕМСЯ

**Парасон — гэта распаўсюджаны магічны артэфакт, які перашкаджае выпадзенню ападкаў, пакуль вы яго носіце, але здольны выклікаць зацяжны лівень, як толькі вы забудзеце яго дома.**

У Кітаі спадарожнікавую талерку прыкручваюць да бамбука, які расце. У выніку з кожным днём становіцца на чатыры каналы больш.

**— Хто твае бацькі?**
**— Стваральнікі дасканаласці.**

Нявестка — гэта крывая, распусная, непрыгожая, лянівая сваячка святой жанчыны.

**— Дарагая, давай дамовімся: я кажу, што ГЭТА вельмі смачна, а ты больш ГЭТА ніколі не гатуеш!**

— Дзяўчаты, а мне мой сказаў, што ў мяне аксамітная скура!
— Дурніца, аксаміт — гэта кароткая шэрсць!



caricatura.ru

**Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў аўторак, 5 мая.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1693.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 29 красавіка 2015 года.